Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 286 (5119)
СНЕЖНЯ
22
СУБОТА
1934 г.
ГОД ВЫДАННЯ XVI

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

ФІЛЬМА „ЧАПАЕЎ“ У ВАРШАВЕ

ВАРШАВА. 20 снежня (БЕЛТА) У вялікім кіно «Мажэстык» адбыўся учора закрыты паказ кіно-карціны «Чапаеў», арганізаваны паўпрэдствам СССР. Агромны зал быў бітком набіт. Прыбылі прадстаўнікі ўрадавых і ваенных колаў, дыпламатычны корпус, у тым ліку ўвесь склад французскага пасольства, літаратары, журналісты і т. д. Паказ прайшоў з велізарным поспехам.

Асобныя сцэны суправаджаліся аднадушным гулам адабрэння і апладысментамі. Многія дзеячы мастацтва выказалі членам паўпрэдства захапленне дасягненнямі совецкай кіноматаграфіі.

ВІЦЕБСКАЯ ПРАМЫСЛОВАСЦЬ ВЫКАНАЛА ГАДАВЫ ПЛАН

ЦК КП(б)Б — т.т. ГІКАЛО, ВАЛКОВІЧУ,
СНК БССР — т. ГАЛАДЗЕДУ,
ЦСПСБ — т. КАВАЛЬЧУКУ.
РЭДАКЦЫЯМ «ЗВЯЗДЫ» і «РАБОЧЕГО».

У рэзультаце выключна вялікай і штодзённай дапамогі і цвёрдага кіраўніцтва ЦК КП(б)Б і асабіста тва. Гікало, ажыццяўляючы рашэнні XVII з'езда ВКП(б), віцебская прамысловасць датэрмінова выканала промфінплан за 1934 год. 20 снежня на 100,3 проц. (план па саюзнай і мясцовай прамысловасці 154.542,5 тыс. руб., выканана 155.067 тыс. руб.).

Гэтых першых поспехаў мы дабіліся на аснове няўхільнага выканання рашэнняў ЦК КП(б)Б аб віцебскай партарганізацыі, шляхам шырокага разгортвання масавай работы, увагі «дробязям» работы прадпрыемстваў, разгортвання социялістычнага спаборніцтва, зотаўскага руху (на 15 снежня на прадпрыемствах Віцебска налічваецца 5 тысяч значністаў-зотаўцаў).

Ставім сваёй важнейшай задачай настойлівую штодзённую работу па замацаванню першых дасягненняў, па знішчэнню недахопаў у рабоце прамысловасці, па бязпітаснай барацьбе з маючымся самаспалананнем.

Пролетарыі Віцебска ў адказ на гістарычнае рашэнне лістападаўскага пленума ЦК ВКП(б) бяруць на сябе абавязацельства ўдарнай работай па перавыкананню промфінплана, у падарунак XI усебеларускаму з'езду советаў дабіцца гонару занясення віцебскіх заводаў і фабрык у Чырвоную кнігу імя XI з'езда советаў БССР.

Сакратар ГК КП(б)Б ЖУРАЎЛЁЎ.
Старшыня горсовета АВЕРЫН.
Нам. старшыні горпрофсовета ГІТЛІНА.
Рэдакцыя «Віцебскі Пролетарый» ФРЭЙДЛІН.

РАЗГАРНУЦЬ САМАТУЖНУЮ ВЫТВОРЧАСЦЬ У КАЛГАСАХ

Сваёй пастановай «аб палітаддзелах у сельскай гаспадарцы» лістападаўскі пленум Цэнтральнага Камітэта нашай партыі ўказаў усім партыйным і совецкім арганізацыям, што зараз, як ніколі павялічваецца іх адказнасць за далейшы ўздым сельскай гаспадаркі, за завяршэнне ля социялістычнай перабудовы, за хутчэйшае ажыццяўленне лозунга таварыша СТАЛІНА «зрабіць усіх калгаснікаў заможнымі». Каб паспяхова справіцца з ускладненымі на іх задачамі, раённыя арганізацыі павінны перш за ўсё зразумець, што яны адказваюць не толькі за бягучыя сельскагаспадарчыя кампаніі, але і за ўвесь палітычны і гаспадарчы стан КОЖНАГА калгаса. На жаль, у рабоце многіх раённых арганізацый пераважае недапушчальная кампанейшчына, а работа ў нашай калгаснай вёсцы прадаўжае быць СЕЗОННАЙ, мала чым адрозніваючыся ў гэтых адносінах ад былой аднаасобнай вёскі. Між тым нішто так не б'е па добрабыту калгаса і калгасніка, як іменна гэта, атрыманая ў спадчыну традыцыя сезоннасці работы.

Цэлы рад зімовых месяцаў пяжаць пад спудам, не выкарыстоўваецца, а незлічоная калгасная сіла.

Друкуемыя намі сёння карэспандэнцыі гавораць наглядна аб тым, якія невычарпальныя крыніцы калгасных даходаў адкрываюцца нам, калі мы сур'ёзна зоймемся пытаннем аб тым, каб даць калгаснику і калгасніцы работу НА ПРАЦЯГУ КРУГЛАГА ГОДА.

Пытанне аб заможным жыцці трэба ставіць КАНКРЭТНА. Змагацца за заможнае жыццё—значыць выкарыстаць УСЕ магчымыя крыніцы калгасных даходаў, спланаваць работу ў калгасе такім чынам, каб калгаснику не прыходзілася мімаволі пяжаць на печы, каб яго заработак не спыняўся і ў зімовыя месяцы.

Змяшчаемыя намі сёння карэспандэнцыі гавораць аб невычарпальных магчымасцях у гэтых адносінах. Літаральна ў кожным калгасе, куды толькі заглянулі нашы карэспандэнты, ёсць усе даныя за тое, каб непадзіўць сілами калгаснікаў выраб каштоўнейшай прадукцыі для рынка і гэтым павялічыць грашовую частку працадня, павысіць пакупную здольнасць калгаса і калгаснікаў, узняць іх матэрыяльны добрабыт. У калгасе «Піонер» (Аршанскага раёна) знаходзяцца калгаснікі-спецыялісты па вырабу чарапіцы, цэглы, гліняных пасудаў. Раней, будучы аднаасобнікамі, яны займаліся гэтай справай прыватным саматужным спосабам, цяпер яны з задаваленнем арганізаваліся-б у арцель па вырабу гэтых прадметаў на зімовы перыяд. Але... не знаходзіцца такіх кіраўнікоў, [illegible] арганізавалі. У калгасе «Маяк комуны» (таксама Аршанскага раёна) ёсць добрыя майстры, якія могуць рабіць сані, калёсы, а таксама розную хатнюю мэблю.

У калгасе «VI з'езд советаў» (Горацкага раёна) летам навет працавала маленькая арцель з 4—5 чалавек па вырабу калёс для патрэб калгаса, але з наступленнем зімы, замест таго, каб справу пашырыць, яе спынілі зусім.

Тысячы калгаснікаў прабуюць у індывідуальным парадку знайсці сабе зімой заработак у якім-небудзь майстэрстве. У калгасах Аршаншчыны, напрыклад, «1 мая», «Чырвоная зорка» і інш., калгаснікі вырабляюць гонты і возяць іх на базар. У другіх калгасах калгаснікі прабуюць рабіць бачонкі, кадушкі і т. д. Усе яны ўпіраюцца ў вялікія труднасці, будучы не ў стане індывідуальным парадкам забяспечыць сябе неабходнай сыравінай. Усе яны з вялікім задаваленнем арганізаваліся-б у арцелі, калі-б знайшліся людзі, якія здагадаліся іх арганізаваць.

Але справа стаіць з-за адсутнасці ўвагі к гэтаму пытанню як з боку праўлання калгасаў і сельсоветаў, так і з боку раённых арганізацый.

Са злачынней растратай часу і сіл у калгасах трэба пакончыць. Райкомы, райвыканкомы, сельсоветы павінны ўзяць у свае рукі кіраўніцтва гэтай справай і зрушыць пытанне з мёртвага пункту.

«Звязда» і Барысаўскі РК 24 снежня склікаюць раённую канферэнцыю па пытанню разгортвання саматужнай вытворчасці. Другія раёны павінны паследаваць гэтаму прыкладу. Трэба сабраць вопыт нямногіх маючыхся сям-там калгасных саматужных арцелей, трэба прабудзіць ініцыятыву калгаснікаў.

Сыравінныя магчымасці (лес, гліна і т. д.) у нас агромадныя. Трэба ўмець іх выявіць і паставіць на службу справе саматужнай вытворчасці ў калгасах. Мы можам і павінны на працягу зімы забяспечыць сваю калгасную вёску калёсамі, вазамі, граблямі, санямі, мэбляй, гліняным пасудай—словам, усім, што можа быць выраблена на месцы сваімі сіламі з мясцовых матэрыялаў. Мы можам задаволіць патрэбы і гарадскога насельніцтва ў гэтых прадметах, калі разгорнем саматужную вытворчасць у калгасах.

Паміма таго, што такім шляхам мы зможам вырашыць патрэбу калгасаў у большай частцы неабходнага інвентару, мы зможам узняць даходнасць калгаснікаў.

Не трэба забываць, што зараз, у сувязі з ліквідацыяй картачнай сістэмы на хлеб і рад іншых прадуктаў, у сувязі з далейшым разгортваннем калгаснага гандлю грашовая частка працадня набывае выключнае значэнне.

І так, за справу! Няхай кожны РК, РВК, сельсавет КАНКРЭТНА разгорне работу па арганізацыі саматужнай вытворчасці ў кожным калгасе.

АД СОВЕТА НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ СССР

Совет Народных Камісараў Саюза ССР з глыбокім жалем паведамляе аб смерці члена Усерасійскага Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта, акадэміка МАРРА Нікалая Якаўлевіча.

Прэзідыум Усерасійскага Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта з глыбокім жалем паведамляе аб смерці члена Усерасійскага Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта, заслужанага дзеяча навукі акадэміка МАРРА Нікалая Якаўлевіча, паследаваўшай у г. Ленінградзе 20 снежня.

ПРЫЦЯГНУЦЬ ДА АДКАЗНАСЦІ КУЛАЦКАГА АГЕНТА.

ГАРАДОК. (Ад спецыяльнага карэспандэнта «Звязды»).

Ужо 8 лістапада ў калгасе «Новы свет», Качанскага сельсовета, культаг і п'яніца Лявонаў Давід абіў піонера, актыўнага дзяткора Кандрашова Яна за тое, што ён напісаў пра яго праделкі ў газету. Газета замест таго, каб узняць гэта пытанне на прынцыповае-палітычнае вышыню, абмежавалася тым, што змясціла на апошняй старонцы ў нумары за 26 лістапада ў некалькі радкоў заметку.

Аб гэтым факце таксама добра ведае райпракурор, які не палічыў патрэбным прыцягнуць да адказнасці злачынца Лявонава Давіда.

Н. НЕЙДЛІН.

АД РЭДАКЦЫІ:

Змяшчаючы артыкул спецкора «Звязды» т. Нейдліна аб збіенні актывіста-піонера куляцкім агентам Лявонавым «Звязда» лічыць, што раённая газета і раённая пракуратура дапусцілі грубую памылку, не ўзняўшы гэты факт на прынцыповую палітычную вышыню.

«Звязда» патрабуе ад пракуратуры неадкладнага прыцягнення да суровай адказнасці кулацкага тэрарыста Лявонава, які збіваў дзяткора Кандрашова.

У Народным Камісарыяце Унутраных Спраў СССР

Папярэдняе расследаванне па справе аб забойстве члена Прэзідыума ЦВК СССР і сакратара ЦК і ЛК ВКП(б) т. С. М. КІРАВА закончана 20 снежня г. г., і справа перадана ў ваенную калегію Вярхоўнага суда Саюза ССР.

Расследаваннем устаноўлена, што Л. В. Нікалаеў, зрабіўшы 1-га гэтага снежня ў Смольным свае гнуснае злачынства, з'яўляўся членам тэрарыстычнай падпольнай антысовецкай групы, якая стварылася з ліку ўдзельнікаў былой зіноўеўскай апазіцыі ў Ленінградзе.

Устаноўлена, што забойства тва. КІРАВА было зроблена Нікалаевым па даручэнню тэрарыстычнага падпольнага «Ленінградскага цэнтра», пераданаму яму членам і адным з кіраўнікоў гэтага цэнтра Катлыновым І. І.

Следства высветліла, што мотывамі забойства т. Кірава з'явілася імкненне гэтай падпольнай антысовецкай групы дэзарганізаваць кіраўніцтва совецкага ўрада шляхам тэрарыстычных актаў, накіраваных супроць галоўных кіраўнікоў совецкай улады, і дабіцца такім шляхам змянення цяперашняй палітыкі ў духу так званай зіноўеўска-троцкісцкай платформы.

Што датычыць забойства т. Кірава, то тут, згодна заявы абвінавачаных, меў месца дадатковы матыў помсты ў адносінах т. Кірава, разбіўшага ідэйна і палітычна ленінградскую групу былых зіноўеўцаў. Нікалаеў гаворыць у сваіх паказаннях: «З Кіравым у былой апазіцыі ёсць свае асобныя рахункі ў сувязі з той барацьбой, якую ён арганізаваў супроць ленінградскіх апазіцыянераў».

Расследаваннем устаноўлена, што гэта антысовецкая група прадстаўляла сабой замкнутую групу, страціўшую ўсякую надзею на падтрыманне мас, палітычна асуджаную і стаўшую, з прычыны безнадзейнасці ажыццяўлення сваіх мэт, на шлях тэрору.

Устаноўлена, што ў склад нелегальнага тэрарыстычнага «Ленінградскага цэнтра» ўваходзілі: Катлынаў І. І., Шатскі Н. Н., Румянцэў В. В., Мандзельштам С. О., Мясніковаў Н. П., Левін В. С., Сасіцкі Л. І. і Нікалаеў Л.—усе былыя члены зіноўеўскай апазіцыі.

Па данай справе арыштаваны і ў адпаведнасці з пастановамі цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саюза ССР ад 10-VII і 1-XII г. г. аддаюцца суду ваеннай калегіі Вярхоўнага суда Саюза наступныя асобы: НІКАЛАЕЎ Л. В., КАТАЛЫНАЎ І. І., МЯСНІКОЎ Н. П., ЛЕВІН В. С., ШАТСКІ Н. Н., МАНДЗЕЛЬШТАМ С. О., СОКАЛАЎ Г. В., ЗВЕЗДОЎ В. І., ЮСКІН І. Г., РУМЯНЦЭЎ В. В., АНТОНАЎ Н. С., ХАНІК А. О., ТОЛМАЗАЎ А. І., САСІЦКІ Л. І.

Усе гэтыя асобы ў розныя часы выключаліся з партыі за прыналежнасць да былой антысовецкай зіноўеўскай апазіцыі, і большасць з іх была адноўлена ў правах членаў партыі пасля іх афіцыяльнага заяўлення аб лоўнай салідарнасці з палітыкай партыі і совецкай улады, а Нікалаеў, выключаны з партыі ў пачатку 1934 года за парушэнне партыйнай дысцыпліны, быў адноўлен праз два месяцы з прычыны яго заяўлення аб раскаянні.

(БЕЛТА).

РАЗБОЙНІЦКАЕ ГНЯЗДО У БЕЛГРАДЗЕ

У розных капіталістычных краінах з ведама і благаславення ўрадаў існуюць гнёзды бандыцкага індывідуальнага тэрора, падтрымліваемыя цярпімымі грашыма.

Пасля забойства югаслаўскага караля і французскага міністра ўрад Югаславіі залемантаваў на ўвесь свет аб тэрарыстычным лагеры ў Венгрыі. Югаславія зрабіла следства аб Янка-Пушце, дзе інструктары венгерскай арміі натаскваілі харвацкіх тэрарыстаў на забойства караля. Югаславія не назвала другога месца, дзе таксама адкрыта адбываецца падрыхтоўка разбойніцкіх тэрарыстычных нападаў. Гэта месца — Югаславія.

Ні ў адной краіне агіднае атрэп'е рускай белагвардзейшчыны не знайшло такога цёплага прытулку, як у Югаславіі. Тут адкрыта заклікаюць да забойстваў відных прадстаўнікоў совецкай улады, тут рыхтуюць змовы і замахі. Не паспелі замоўкнуць водгукі па ўсяму свету на забойства Александра і Барту, не паспелі страпацца жалобныя сцягі, якімі ўвешала сябе сталіца Югаславіі, як іменна **ў Белградзе прагучэў заклік да забойства тва. Кірава.**

Гэта было ў пачатку лістапада, калі Югаславія лемантавала на ўвесь свет аб сваёй страце, калі яна разгрывала з сябе няўцешную ўдаву і абівала ўсе дыпламатычныя парогі, патрабуючы спачування і падтрымання.

Яе дыпламаты пісалі ноты і пралівалі слёзы. У гэты час на тэрыторыю Югаславіі антысовецкая мразь узбройвалася грашыма і іншымі сродкамі для пропаведзі і арганізацыі індывідуальнага тэрора.

Сярод іншых белагвардзейскіх арганізацый у Югаславіі дзейнічае «Нацыянальны саюз новага пакалення». У лістападаўскім нумары лістка «За Россию», які выходзіць у Белградзе, быў надрукаван адкрыты заклік да забойстваў правадыроў совецкай краіны. У артыкуле «Чаго яны баяцца» прама сказана:

«Іх знішчэнне — першая задача і галоўны клопат наш».

Лісток называў імёны вядомых усяму свету і ненавісных ворагам рабочага класа людзей і адкрыта ўказваў:

«Трэба ўбраць Кірава ў Ленінградзе».

Брыдоты называлі подлае забойства «вялікай справай» і такалі, што следам за стрэлам у Ленінградзе паследуюць і другія. Яны не толькі раскрывалі палітычны замысел забойства і давалі яму сваю матывіроўку, яны і прама ўказалі на сваю блізкую сувязь з бандытамі-тэрарыстамі, якія прабіраюцца ў совецкую краіну і дзейнічаюць у ёй. У артыкуле «Як змагацца?» яны гавораць «аб дзеянні ў больш вузкім сэнсе». Гэта дзеянне — індывідуальны тэрор.

«Дзеянне адзіночнае рэкамендуецца тым моцным болей людзям, якія высветлілі, што ў акружаючым іх асяроддзі няма нікога, на каго можна-б палажыцца».

Яны прызнаюць сваю сувязь з бандытамі, якія, атрымаўшы вывучку ў такіх краінах, як Югаславія, забяспечаныя грашыма і зброяй, прабіраюцца праз совецкія граніцы і нападаюць у рукі совецкай улады. Яны шлюць благаславенне гэтым сваім братам па агульнай звярынай нянавісці да большэвікоў, да рабочага класа.

«Ужо ёсць рэальныя рэзультаты — тлінуць яны — Напы заклікі дайшлі да вас. Лепшыя з нас ідуць к вам і гінуць». Вось дакладны адказ на фальшывы дымант буржуазнага друку аб тым, быццам совецкія суды расстрэльваюць «невінаватых».

Перад намі адна банда контрэволюцыйнай белагвардзейшчыны. Сама па сабе гэтая чалавечая мразь нікчэмна. Выкінутая на сметнік гісторыі, адчаяўшаяся ва ўсіх адкрытых сродках барацьбы з комуністычнай партыяй і совецкай уладай, расчараваўшаяся ў блізкай інтэрвенцыі, яна ўся жыве пачуццём бяссільнай злобы растаптаных гадзін.

Іх небяспека — у падтрымцы, якое ім аказваюць урады некаторых буржуазных краін. Мы бачым Югаславію ў першым раду гэтых краін. Югаславія — ачаг самай махровай тэрарыстычнай рознавіднасці белагвардзейшчыны. Мы бачым, што апека над белагвардзейскімі бандытамі-тэрарыстамі не спынілася і пасля таго, як ад рукі фашысцкага тэрарыста загінуў кароль Югаславіі. Гэта яшчэ гаворыць аб цане, якую мае пакаяная барацьба міжнародняй буржуазіі супроць індывідуальнага тэрора. Разбойніцкія прыёмы і разбойніцкія арганізацыі патрэбны некаторым капіталістычным краінам. На гэтым пабудавана існаванне ўрадаў гэтых краін.

Рабочы клас і працоўныя Совецкага Саюза, як і пролетарыят усяго свету, як і спачуваючая нам чэсная інтэлігенцыя ў капіталістычных краінах, ліпні раз пераканаюцца на публікуемым сёння матэрыяле ў адзіным фронце палонкаў быўшай зіноўеўскай групы і белагвардзейскіх забойцаў з белградскага разбойніцкага гнязда. У іх агульныя погляды, агульныя шляхі контрэволюцыйнага падполля. Іх чакае і агульны лёс.

Галзіна прабуе падняць галаву і ўкусіць у пяту рабочы клас. Галзіна будзе размажджана.

(«ПРАВДА»).

Уноў выбраны старшыня Менгорсовета т. Жуковіч.

АБ ХОДЗЕ РАМОНТУ ТРАКТАРОЎ

Пастанова Совета Народных Камісараў БССР

СНК БССР адзначае, што:

а) у выніку злачынна-бяздзейных адносін з боку кіраўніцтва Путчынскай і Хойніцкай МТС да правядзення важнейшай справы — рамонту трактароў і сельскагаспадарчых машын — і прамога ігнаравання выканання пастановы ЦК КП(б)Б і СНК БССР ад 10-XI—1934 г. «Аб асенне-зімовым рамонце трактароў», выкананне плана рамонту трактароў IУ кв. г. г. па Путчынскай і Хойніцкай МТС фактычна сарвана і на 10-XII—г. г. да рамонту яшчэ не прыступлена;

б) да гэтага часу як па Путчынскай, так і па Хойніцкай МТС не падрыхтаваны майстэрні, а таксама варштаты, інструменты і належны інвентар для правядзення зімовага рамонту трактароў і с-г. машын, адсутнічае арганізацыя пастаянных брыгад па рамонту, няма норм выпрацоўкі, не ўстаноўлены календарныя планы рамонту. Зусім нездавальняюча пастаўлена справа матэрыяльна-бытавога і культурнага абслугоўвання рабочых майстэрань.

Совет Народных Камісараў БССР ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. За злачынна-халатныя адносіны да правядзення рамонту трактароў, зрыў плана рамонта ў IУ квартале г. г. дырэктару Путчынскай МТС т. Маеву і дырэктару Хойніцкай МТС т. Катлярову абвясціць вымову, папярэдзіўшы іх, што калі імі не будзе зроблен карэнны пералом у рабоце і не будзе забяспечана ў двухдэкадны тэрмін выкананне планавага задання па рамонту трактараў і с-г. машын, — яны будуць зняты з работы як нездольныя выконваць важнейшыя мерапрыемствы партыі і ўрада.

2. Прапанаваць дырэктарам Хойніцкай і Путчынскай МТС у 5-дзённы тэрмін забяспечыць:

а) поўнае абсталяванне майстэрань, устанаўленне патрэбных варштатаў і інструментаў, рамонт памяшканняў майстэрань і іх уцяпленне.

Выкупіць вызначаныя для МТС на III і IУ кв. запасныя часткі і завесці правільны ўлік расходвання іх для кожнага трактара асобна з адзнакай у пашпарце;

б) арганізаваць сталыя брыгады па рамонту з раз'язных і участковых механікаў і пешых трактарыстаў, распрацаваць календарныя планы рамонту, устанавіць тэхнічныя нормы выпрацоўкі, правільныя расцэнкі і тарыфную сетку аплаты рабочых з тым, каб усе гэтыя мерапрыемствы былі шырока абгаворены на нарадах рабочых і ІТР і даведзены да кожнай брыгады і рабочага МТС;

в) правесці рамонт памяшканняў і навесаў для хавання ў зімовы час трактароў і ўсіх с.-г. машын і інвентара.

3. Прапанаваць Белканторы Ватазапчасць (т. БУДНІКУ) забяспечыць камплектнае снабжэнне МТС запаснымі часткамі, асабліва ўзмацніць завоз вострага дэфіцытных дэталяў, як напрыклад: да трактара «ХТЗ» — падшыпнікі пярэдніх капёс і задняй палувосі, сярэдняя вялікі наробкі хуткасцей і ўкладышы шатуна, да трактара «ФП» — падшыпнікі чарвяка.

4. Прапанаваць НКЗемляробства аказаць належную дапамогу гэтым МТС у рабоце і забяспечыць тэхнічны кантроль і кіраўніцтва ў справе рамонту, камандзіраваўшы на час рамонту сваіх спецыялістаў.

5. Абавязаць НКЗемляробства ў 5-дзённы тэрмін забяспечыць Путчынскую і Хойніцкую МТС неабходнымі сродкамі на аплату занераджаных ім запасных частак да трактароў і с.-г. машын.

6. Абавязаць старшынь РВК ежэдзённа займацца справай рамонту трактароў і с.-г. машын у МТС і МТМ і неадкладна разгарнуць работу па рамонту с.-г. машын і інвентара па калгасному і аднаасобнаму сектару раёна.

7. Аб выкананні планаў рамонту трактароў і с.-г. машын і гэтай пастановы заслухаць на паседжанні СНК 4-I—35 г. даклады дырэктароў Хойніцкай і Путчынскай МТС з папярэдняй праверкай работы НКЗемл і кіраўніцтвам спраў СНК БССР.

СТАРШЫНЯ СОВЕТА НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР
М. ГАЛАДЗЕД.
КІРАЎНІК СПРАЎ СОВЕТА НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР
С. ШАБАЛТАС.

14 снежня 1934 г.
г. Менск.

Па Совецкаму Саюзу

АБ ПЕРАТВАРЭННІ МАРДОЎСКАЙ АЎТАНОМНАЙ ВОБЛАСЦІ У АЎТАНОМНУЮ СОВЕЦКУЮ СОЦЫЯЛІСТЫЧНУЮ РЭСПУБЛІКУ

Пастанова прэзідыума Усерасійскага Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта.

Прэзідыум Усерасійскага Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта пастанаўляе:

Мардоўскую аўтаномную вобласць, у адпаведнасці з волевыяўленнем яе працоўнага насельніцтва, ператварыць у існуючых границах у Мардоўскую аўтаномную Совецкую Соцыялістычную Рэспубліку.

Старшыня Усерасійскага Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта
М. КАЛІНІН.

Сакратар Усерасійскага Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта
А. КІСЕЛЕЎ.

Масква, Кремль, 20 снежня 1934 г.

***

Мардоўская аўтаномная вобласць, згодна пастановы Усерасійскага Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта ператвораная ў аўтаномную Совецкую Соцыялістычную Рэспубліку, уваходзіць у склад Сярэднее-Волжскага края. Вобласць створана 5 год назад з Мардоўскай акругі. У ёй — каля паўтара мільёна насельніцтва, пераважна мардвы і татар.

У царскія часы мардва была выключна адсталай народнасцю. У 1931 годзе сярод насельніцтва было толькі 12 проц. граматных. Насельніцтва не выходзіла з голаду і галечы.

У сучасны момант з сельскай гаспадаркі Мардовіі канчаткова выцеснена саха. Працуюць 27 машынатрактарных станцый, звыш 1000 трактароў. 67 проц. сялянскіх гаспадарак калектывізаваны.

Атрымала таксама развіццё прамысловасць. Пабудован катанінны завод, кансервовы камбінат у Саранску, вінакурны, гарбарны і інш. заводы.

Вялікія поспехі дасягнуты ў павышэнні культурнага ўзроўню насельніцтва. З 1934 года ўведзена ўсеагульнае абавязковае навучанне. Ужо 90 проц. насельніцтва грамотнае.

ВЫНІКІ СОВЕЦКА-ПОЛЬСКАЙ ЧЫГУНАЧНАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ

З 13 па 19 снежня ў Маскве праходзіла канферэнцыя прадстаўнікоў совецкіх і польскіх чыгунак. Канферэнцыя была прысвечана пытанням узгаднення раскладу руху пасажырскіх і таварных паяздоў па пагранічных станцыях СССР і Польшчы: Валачыск і Падвалачыск, Шэпетоўка і Здолбунова, Негарэлае і Стоўпцы, Жыткавічы і Мікашэвічы, Радашковічы і Алянковічы, Фарынава і Загадце.

Па Паўднёва-Заходняй дарозе расклад паяздоў узгоднен з такім разлікам, каб забяспечыць прамую пасажырскую сувязь Львоў — Одэса і Львоў — Кіеў праз Валачыск і Жмерынку. Тут будуць курсіраваць «мякгія» (мякка-жосткія вагоны) з плацкардными спальнымі месцамі ад Валачыска да Одэсы і ад Валачыска да Кіева.

Па другіх напрамках істотных змен у расклад не ўнесена, паколькі існуючыя да гэтага часу расклады адавальняюць пасажыраў Совецкага Саюза і Польшчы.

Па прапанове прадстаўнікоў совецкіх чыгунак на канферэнцыі было пастаўлена пытанне аб прамой сувязі з Венай і Прагай.

ГОРАД У СНЕЖНАЙ ПУСТЫНІ

ЛЕНІНГРАД. 20 снежня. (БЕЛТА). 30 снежня працоўныя Кіраўска (былы Хібінагорск) святкуюць пяцігоддзе свайго горада. На месцы, дзе была голая, дзікая тундра за небывала кароткі тэрмін вырас гэты выдатны горад—увасабленне арамадной энергіі, невычарпальнай ініцыятывы і большэвіцкай настойлівасці т. С. М. Кірава, пад настойніцтвам якога пабудован Хібінагорск.

Разам з горадам тут вырасла апатытавая прамысловасць. Ніўская запалярная гідрастанцыя і інш. прамысловыя прадпрыемствы. Снежная пустыня стала адным з багацейшых раёнаў Совецкай Поўначы. У прамысловасць і гарадскую гаспадарку Кіраўска ўкладзена ўжо 200 млн. руб. Хібіны далі ўжо больш 5 млн. руды. Зараз у Кіраўску каля 40 тыс. жыхароў. Тут ёсць два тэхнікумы і 12 школ, у якіх навучаюцца 5500 дзяцей. Адкрыта 9 амбулаторый, паліклініка, пральня, лазні. Горад мае тэлефонную сетку, водаправод. Шырока разгорнута гандлёвая сетка.

З'ЕЗД СОВЕТАЎ ЯЎРЭЙСКАЙ АЎТАНОМНАЙ ВОБЛАСЦІ

БІРА-БІДЖАН. 20 снежня. (Па тэлеграфу ад карэспандэнта «Звязды»).

Другі дзень з'езда. Ідуць спрэчкі па справаздачнаму дакладу краёвага камкома. Выступаюць на яўрэйскай, рускай, карэйскай, беларускай, украінскай мовах рабочыя, калгаснікі, чырвоназаможныя, прадстаўнікі дэлегацый рэспублік. Вітаюць аднадушна са стварэннем яўрэйскай аўтаномнай вобласці.

Выступленні пераходзяць у жывую дэманстрацыю інтэрнацыянальнага адзінства працоўных. Заслужаны рапарт звяна самалётаў прыляцеўшых на з'езд і прыехаўшых замежных дэлегатаў—Эпштэйна ад Амерыкі, Штэйна ад Францыі. З энтузіязмам спаткана выступленне тав. Харыка ад імя ЦВК і Совнаркома БССР. Авацыяй спаткана крыж вітанне рабочай дэлегацыі Ленінграда.

На вячэрнім паседжанні выступіў спатканы авацыяй сакратар крайкома ВКП(б) тав. Лаўрэнц'еў.

24 СНЕЖНЯ «ЗВЯЗДА» І БАРЫСАЎСКІ РК СКЛІКАЮЦЬ У БАРЫСАВЕ РАЁННУЮ НАРАДУ, ПРЫСВЕЧАНУЮ ПЫТАННЮ РАЗГОРТВАННЯ САМАТУЖНАЙ ВЫТВОРЧАСЦІ У КАЛГАСАХ.

На тэмы дня

ХАТА-ЧЫТАЛЬНЯ

У Белеўскай хаце-чытальні (калгас «III Інтэрнацыянал», Жыткавіцкага раёна) заўсёды шмат народу. Сюды прыходзяць старыя і малатыя, калгаснікі і калгаснікі. Прыходзяць паслухаць даклад, радыё і патэфон, пайграць у шахматы і шашкі, пачытаць газету і кнігу. Ёсць пры хаце-чытальні спецыяльны пакой для адпачынку калгаснікаў. Пры хаце-чытальні згуртована даволі значны актыў, пры дапамозе якога кіраўнік хаты-чытальні тав. Барысёнак мабілізаваў усіх калгаснікаў на арганізацыю парку, у якім пасаджана 312 дрэў, на пракладку тратуараў, забруківанне вуліцы, на пабудову спецыяльна абгароджанага памяшкання, у якім кароўы калгаснай фермы і калгаснікаў маглі-б адпачыць.

Тав. Барысёнак не чакаў, пакуль з Менска ці з раёна яму хто дапаможа сродкамі для абсталявання хаты-чытальні. У сябе ў калгасе мабілізаваў ён тысячы рублёў і на гэтыя грошы прыбраў хату-чытальню ў поўны парадак да зімы.

Ці шмат у нас падобных хат-чытальень?

У параўнанні з мінулым годам хаты-чытальні значна лепш падрыхтаваны да зімы. Палепшыўся склад загадчыкаў хат-чытальень, больш увагі пачалі, чым іх звычайна, раённыя арганізацыі, палітадзелы, сельсоветы, праўленні калгасаў. Але тым не менш мы ўсё яшчэ маем у радзе раёнаў шмат фактаў, калі ў хатах-чытальнях гуляе вецер, калі яны на замку.

З Няхлюдаўскага сельсовета, Талачынскага раёна, нам пішуць, што хата-чытальня на замку, што калгаснікі хацелі-б правесці свой вольны час у чытальні, але прастаяўшы каля зачыненай дзверы, разыходзяцца.

Галоўная прычына нездавальняючай работы хат-чытальень—амэль поўная адсутнасць да іх увагі з боку раённых арганізацый. Больш таго, як правіла, добрых кіраўнікоў хатамі-чытальнямі райкомы пераходзяць на іншыя работы. Нямала фактаў, калі зарплату, якую дзяржава адпускае на ўтрымане загадчыкаў хат-чытальень, выкарыстоўваюць на ўтрыманне іншых работнікаў раёна. Зусім яшчэ нядаўна Бабруйскі райком партыі перавёў усю зарплату 30 загадчыкаў хат-чытальень у 9 пунктаў для аплаты 9 парторгам, а хаты-чытальні былі пакінуты без кіраўнікоў.

Мы пераходзім у новы этап калгаснага будаўніцтва. Без усяго ліквідацыі калгаснай маёмасці, без узбраення калгаснікаў агранамічнымі і зоатэхнічнымі ведамі немагчымы далейшы рост большэвіцкіх і заможных калгасаў. Гэта павінны ўлічыць усе раённыя арганізацыі.

Абавязак усіх раённых арганізацый — зрабіць так, каб на ўсіх хатах-чытальнях былі створаны такія ўмовы, якія-б дазволілі ім з поспехам выконваць ускладзеныя на іх абавязкі.

РЭВОЛЮЦЫЙНАЯ ПІЛЬНАСЦЬ, КАНКРЭТНАСЦЬ У РАБОЦЕ, ЧУЛЫЯ АДНОСІНЫ ДА ПАТРЭБ І ЗАПРОСАУ ПРАЦОУНЫХ—

вось што павінна пранізваць работу новых райвыканкомаў і сельсоветаў

Тав. ЕУСЦІНА—работніца швейнай фабрыкі «Окцябр», ударніца-комсамолка, герой першай пяцігодкі—выбрана членам Менгорсовета.

НЕ БЫЛО ПАЛІТЫЧНАЙ ЗАВОСТРАНАСЦІ

ЖЛОБІН, 19. (Па тэлефону ад кар. «Звязды»).

На раённым з'ездзе советаў старшыня РВК тав. **Адамчук** рабіў справаздачу за перыяд 4-х год. У гэты час аданы ў эксплаатацыю крухмальны завод «Эрштэр май», валавая прадукцыя якога складае 600 тыс. руб., шыла-рэзачны завод, гушчан Лукаўскі торфазавод, хлебазавод і інш. прадпрыемствы. 40 прамысловых прадпрыемстваў налічваецца па раёну. Замест царквы—85 беларускіх школ, 3 яўрэйскія, 4 рускія, 2 польскія, 245 вячэрніх школ, 23 дамы соцкультуры, 3 клубы, тэатр, 2 кінатэатры, 3 кіно-перасоўкі і т. д.

Не пазнаць і вёскі, 57.3 проц. сялянскіх гаспадарак аб'яднаны ў 150 калгасаў. Надзвычай вырасла механізацыя, у раёне ёсць 107 сявазак, 13 жнэйрак, 93 ільномалатарні і т. д.

Раён рос разам з усёй краінай, не адставаў. Дакладчык менш за ўсё спыняўся на ўсіх дасягненнях. У гэтым яго заслуга. Большэвіцкая самакрытыка, вострая крытыка недахопаў у сваёй рабоце — такі быў справаздачны даклад тав. Адамчука.

І сапраўды, К сваяму з'езду советаў раён падыйшоў з цэлым радам глыбокіх прарываў. За невыкананне плянаў па ільну, па мясу, па мабілізацыі сродкаў і абавязацельствах па продажу хлеба дзяржаве раён быў занесен кандыдатам на чорную дошку. Заўчасна тут супакоіліся, да кан ца не ламалі сабатажа, не было канкрэтнага, аператыўнага кіраўніцтва калгасамі і сельсоветамі з боку райвыканкома.

Тав. Адамчук спыняўся на пытаннях размеркавання ўраджаю, работы прамысловасці ў раёне і, у межах рэгламенту, на пытаннях спецыфікі раёна — жывёлагадоўлі і бульбе. Яго даклад паміж тым быў дапоўніць загадчык раёна тав. **Люцко**. У сваім дакладзе аб арганізацыйна-гаспадарчым умацаванні калгасаў. Але з самага пачатку свайго выступлення Люцко забыў пра сваю задачу, захапіўся суцветнымі маштабамі і толькі калі старшыня заўважыў аб скарачэнні рэгламента, ён апамятаўся.

Якраз гэта пытанне цікавіла дэлегатаў з'езда. З 150 калгасаў 29 адстаючых і гаспадарча вельмі слабых. Сярод іх калгас «12 гадавіна Окцября», «На варце», «Перамога» і інш. У чым прычыны? Іх не ўскрыў тав. **Люцко**.

З гоўстай папкай статыстычных даных на трыбуну ўзышоў загадчык жывёлагадоўчага аддзялення РВК т. **Шпак**. Ён павінен быў расказаць аб прарывах і дасягненнях, паказаць, як такія калгасы, як «Рассвет-пераможца», імя Войкава, «Будзённы», дабіліся вялікай даходнасці ад сваіх ферм. Чаму 19 калгасаў не маюць апрамаджанай і жывёлагадоўлі. Чаму конскае пагалоўе зменшылася на 2 тыс. Трэба было аданачыць чаму гэта так і што трэба зрабіць, каб палепшыць жывёлагадоўлю ў раёне.

Зусім слаба на з'ездзе разглядалася пытанне аб калгасным прыліве. Раён калектывізаван толькі на 57,3 проц. Гэта на многа ніжэй сярэдняга процента па рэспубліцы. Культурнае выхаваўчая работа з аднаасобнікамі. Пасярэдняе вёскі Крутавец, Бірэвіцкага сельсовета паставілі арку, моў, на адным баку аднаасобнікі, на другім калгаснікі.

Таксама цімаходам гаварылася аб культурна-бытавых пытаннях у калгасах.

Па ўсіх дакладах выступіла звыш 70 чалавек. Большасць з іх перагаварылі свае выступленні ва ўтачыстых дакладчыкі, гаварылі наогул. Так, выступіў старшыня Добрагашчанскага сельсовета Мельнікаў і заявіў, што яму перашкаджала своечасова выканаць абавязацельствы перад дзяржавай надвор'е. Толькі пасобныя таварышы пасля заўвагі сакратара райкома КП(б)Б тав. Плешакова пачалі выступаць па-дзелавому.

Практычна і рашуча было на з'ездзе вырашана пытанне аб дапамозе тэрытарыяльных арганізацый чыгуначнаму вузлу.

Асабліва неабходна вылезліць пытанне нацыянальна-культурнага будаўніцтва. Гэта праблема вісела на з'ездзе не выпадкова. Класавая барацьба на гэтым фронце была асабліва вострай. За апошнія гады ў школах раёна было шмат выпадкаў антысовецкіх выступленняў. Так, вучні школы № 1 арганізавана пабілі воны ў яўрэйскай школе. У школе № 2 настаўніца Іванова спявала з вучнямі нацпамаўскія песні. Вучні Вішнё-Албінскай школы заяўлялі: яўрэяў і палякаў у калгас прымаць нельга. Настаўніца **Смалякова** чытала ўсе свае лекцыі на рускай мове. Настаўнік-комсамолец Вітко пытаўся ў вучняў, ці можа яўрэй быць старшынёй калгаса, а калі так, то ці будзе гэта добра.

Вось і нядаўнія, зусім свежыя факты. У Каліміраўскай школе к Окцябрскім святам вывесілі лозунг: «Няхай жыве нацыяналістычная палітыка». Дырэктар школы Кісялёў і настаўнік гісторыі Бічкоў даказвалі, што гэта правільна.

Усё гэта спакойна паведаміў з'езду загадчык раёна **Стрэльчанка**. На жаль, з'езд не ўзняў гэтага пытання на прынцыпова-палітычную вышыню, не сказаў аб тым, як змагацца з класана-варожымі выступленнямі, не мабілізаваўся на ўзмацненне класавай пільнасці.

Задача заключаецца ў тым, каб у практычнай рабоце папоўніць прабел, аб якім не гаварылася на з'ездзе.

Н. ГАСМАН.

З'ЕЗД АБЯЦАЎ ЗНОЎ ВЫВЕСЦІ РАЁН У ПЕРАДАВЫЯ

БАРЫСАЎ. (Карэспандэнт «Звязды»).

18 снежня закончыў сваю работу УІІ з'езд советаў Барысаўшчыны. З'езд праходзіў пры небывалай актыўнасці калзвычай вырасшых культурна і палітычна працоўных мас. На з'ездзе выступілі ў спорчках больш 100 дэлегатаў. Жадаўшых выступаць было ўдвая больш. Кожны дэлегат прывёз з сабой свае меркаванні, думкі, заўвагі з тым, каб выказаць іх гаспадару раёна і горада — з'езду советаў.

Аб чым было сказана на з'ездзе? Перш за ўсё аб велізарным росце эканомікі і культуры нашай вялікай бацькаўшчыны, часткай якой з'яўляецца Барысаўскі раён.

За час паміж УІ і УІІ раён'здамі, г. зн. за тры гады асноўны фонд прадпрыемстваў Барысава вырас з 9.401 тыс. руб. да 17.227 тыс. руб. За гэты час пачала перабудоўвацца Бярэзінскі камбінат, пабудаван камбінат «Комінтэрн», рэканструіраван завод імя Домбаля. Зараз Барысаў мае 22 прадпрыемствы цэнзавай дзяржаўнай прамысловасці з агульным лікам рабочых 17 тыс. чалавек.

Шмат зроблена ў справе добраўпарадкавання горада, у свой час канчаткова разбуранага грамадзянскай вайной. Барысаў становіцца сапраўды прамысловым горадам.

Аб росце культурнасці гаворыць павелічэнне сеткі пачатковых школ і стопроцантны ахоп школамі дзяцей школьнага ўзросту. За апошнія гады ў горадзе арганізаваны 4 навучальныя ўстановы сярэдняга тыпу.

Яшчэ больш пайшла наперад сельская гаспадарка раёна. 75 проц. працоўных сялянскіх гаспадарак уступіла ў калгасы. Ёсць упэўненасць, што раён веснавую сяўбу 1935 г. сустрэне поўнасцю калектывізаваным. Калгасы арганізацыйна ўмацаваліся і пасляхова змагаюцца за вырашэнне задання, пастаўленай таварышам Сталіным на I усесаюзным з'ездзе калгаснікаў-ударнікаў: «Зрабіць усе калгасы большэвіцкімі, а калгаснікаў заможнымі».

Усё гэта, вядома, адбілася і ў рабоце. Валавасць, упэўненасць, гатоўнасць змагацца і адлаць усе свае сілы на справу сацыялізма — вось што чырвонай ніткай праходзіла ў кожным выступленні дэлегатаў.

Вось на трыбуне сінабароды калгаснік. Ён гаворыць пра новае радаснае жыццё, якое ён атрымаў у калгасе. Але вось на яго вачах з'яўляюцца слёзы. Яго сына-чырвонаармейца калісці расстралялі белапалякі. Старому шкада, што яго сына не ўбачыў таго прыгожага жыцця, за якое загінуў. Стары заклікае:

— Будзем абараняць свае граніцы, будзем шамаваць нашу Чырвоную армію!

Дэлегатка з'езда, старшыня калгаса тав. **Балтынская**, патрабуе смялей вылучыць жанчын на работу. Яна прыводзіць прыклады, калі вылучаным на адказную работу жанчынам не аказваюць патрэбнай дапамогі.

Тав. **Бузо** расказвае, як Варонскі сельсавет змагаецца за ліквідацыю свайго адставання. Гэты сельсавет з'яўляецца самым далёкім і самым эканамічна адсталым сельсветам у раёне. Ён увесь час плёўся ў хвосце астатніх сельсветаў. Але калі туды паслалі добрых работнікаў, сельсавет падцягнуўся і выходзіць у рады перадавікоў. Тав Бузо патрабуе звярнуць больш увагі такім сельсветам, як Баранскі, і тады ў раёне не будзе адстаючых сельсветаў.

Другой істотнай рысай з'езда была жорсткая крытыка недахопаў, якіх у раёне ёсць вельмі і вельмі многа. Галоўная задача — ліквідаваць адставанне раёна ў ільнозагатоўках. Да гэтага часу раён яшчэ не выканаў свайго плана ільнопаставак. У чым прычыны?

Першая і галоўная ў тым, што адразу не ўзяліся за гэту работу як належыць, упусцілі дарагі час. Ды і зараз не ўсе сельсветы, працуюць так, як гэтага патрабуе справа. Перашкаджае ліберальнічанне з сабатажнікамі, адсутнасць канкрэтнасці ў рабоце. Гэта ёсць у Велящыцкім, Аддзяніцкім, Мала-Стахаўскім і іншых сельсветах.

Адстае раён і па мясапастаўках, 1 па выкананню фінплана. Зноў такі тут няма ніякага аб'ектыўнага апраўдання. Заготжывёла і райспажыўтаварыства пакуль што працуюць дрэнна.

Дэлегаты раз'ехаліся па месцах з цвёрдым намерам — ліквідаваць наўныя прарывы з тым, каб вырашыць увесь фронт і вывесці раён у рады перадавікоў.

П. ЧЫКУН.

Своечасова падрыхтаваецца да разгорнутага гандлю хлебам

ТОЛЬКІ СКЛАДАЮЦЬ КАШТАРЫСЫ

Разгортванне вольнага гандлю хлебам у Гомелі патрабуе павелічэння выпечкі на 33 тоны. Для гэтага неабходна адрамантаваць дзве пякарні і пабудаваць завод на 6 печаў.

Гандлёвую сетку трэба пашырыць на 21 адзінку і апрача таго перабудаваць старыя хлебныя крамы.

Як-жа праводзіцца ўсе гэтыя мерапрыемствы?

Па лініі хлебазавода разгорнута сапраўды ўдарная работа. Днём і ноччу працуюць пяць брыгад, якія рамантуюць былыя саматужныя пякарні. Ужо адведзена памяшканне і праводзіцца вялікая работа па пабудове новага завода на 6 печаў магутнасцю ў 17 тон на суткі. Усімі будаўнічымі матэрыяламі хлебазавод поўнасцю забяспечан.

На заводзе разгорнута масавая работа сярод рабочых па збору рацыяналізатарскіх прапаноў па пытаннях палепшэння якасці і павышэння асартыменту хлеба. Для ўзнаўлення кваліфікацыі пекараў арганізаваны спецыяльныя курсы.

Гандлёвая сетка пашыраецца. Лік магазінаў і ларкоў будзе даведзен да 139, з іх 64 спецыяльна хлебных, 10 для продажу кандзітарскіх вырабаў, астатнія магазіны змешаныя.

Гомельскі ЦРК прыступіў да арганізацыі новых трох магазінаў. 12 магазінаў рамантуюцца і пераабсталёўваюцца. Адкрыты курсы па падрыхтоўцы калраў хлебапёкаў, якімі ахоплена 250 чалавек. ЦРК поўнасцю забяспечан рабочай сілай, будаўнічымі матэрыяламі, спецвопраткай.

Побач з гэтым рад арганізацый яўна ігнаруюць дырэктывы партыі ў справе разгортвання хлебагандлёвай сеткі. Даволі ўказаць, напрыклад, на ОРС водпікаў. Ён павінен адкрыць адзін новы магазін і адзін магазін пераабсталяваць. Кіраўнікі ОРС'а толькі зараз складаюць каштарысы на гэтыя работы.

Аддзел рабочага снабжэння сплаўканторы (начальнік **Жолудаў**) таксама да гэтага часу не прыступіў к рамонту магазінаў.

На пікловаводзе ў Касцюкоўцы —буйнейшым рабочым раёне—не рыхтуюцца да разгорнутага гандлю хлебам. Да гэтага часу ідуць дамаўленыя спрэчкі, хто павінен адпусціць сродкі на адкрыцё магазінаў: дырэкцыя завода ці Белкаапсаюз.

Не прыступілі да работы ЗРК «Комінтэрн» (старшыня **Зальцман**) і ЗРК Палесдрук. Яны зусім не турбуюцца аб пашырэнні хлебагандлёвай сеткі. Характэрны факт: 10 снежня пры горсавеце была склікана нарада па пытанню аб падрыхтоўцы да гандлю хлебам. Многія арганізацыі нават не прыслалі сваіх прадстаўнікоў на гэту нараду (ЗРК завода «Пролетарый», Сельмаш, ОРС 5-га раёна).

Часу засталося мала. Патрэбен штодзённы кантроль горсавета і гаркома партыі за выкананнем практычных мерапрыемстваў, намечаных пастановай пленума ЦК КП(б)Б.

К. ГОЗ.

ЗАКОНЧЫЦЬ РАМОНТ ВА УСІХ ШКОЛАХ

(АГЛЯД ПІСЕМ)

Прайшло тры месяцы з пачатку навучальнага года. Але з раду паўнаў усё яшчэ да гэтага часу паступаюць трывожныя сігналы аб непадрыхтаванасці школ да вучобы.

З пачапаўскай няпоўнай сярэдняй школы Чырвонапольскага р-ёна (дырэктар школы тав. Крыпенка) пішуць, што школа не адрамантавана, вокны пабіты, крэслаў, дошак, сталоў не хапае. Вучні сядзяць па 3 чалавек на адной невялікай лаўцы. 500 рублёў дзяржаўных прошай, якія былі даны дырэктару для рамонту школы і закупкі падручнікаў, распрачаны невядома на што.

У анетаўскай няпоўнай сярэдняй школе, Пухавіцкага раёна (дырэктар тав. Сідорын) да гэтага часу няма гарачых снеданняў, не хапае кніжак. Настаўнік па матэматыцы тав. Лобан абазывае вучняў жывёлінамі, штурхае іх у плячо.

У шацкай няпоўнай сярэдняй школе, Пухавіцкага раёна (дырэктар тав. Плашчынскі), адсутнічае сталовая, хоць усе ўмовы для пабудовы сталовай ёсць. У памяшканні, прызначаным для інтэрната, дырэктар зложыў дровы, а кучням прыходзіцца ісці ў школу за 7 кілометраў.

У вялічыцкай поўнай сярэдняй школе, Барысаўскага раёна, у 4-ным нявялікім пакоі займаецца па 68-78 чал. Скамеек не хапае. Падручнікамі школа не забяспечана. У 8 класе падручнікаў зусім няма. Школа ў антысанітарным становішчы. У той час, калі значная частка вёскі электрлена электрычнасцю, школа электрычнасці не мае. Няма настаўнікаў па рускай і беларускай мовах. Не хапае і двух настаўнікаў у 1 канцэнтры. Адносіны дырэктара да настаўнікаў вельмі дрэнныя. Калі настаўнік Градовіч прышоў да дырэктара дагаварыцца аб сенажаці школьнага саду, дырэктар абазваў настаўніка і выгнаў яго з кватэры.

Холмчынская няпоўная сярэдняя школа (Рэчыцкага раёна) да гэтага часу не мае настаўнікаў па геаграфіі, гісторыі, чарчэнню.

У крыўскай няпоўнай сярэдняй школе (Нараўлянскі раён) настаўнікі не праводзяць ніякай работы па выхаванню дзяцей. Настаўнікі Варпоўская, Пік, Кухаранка, Цыпачук часта выключаюць дзяцей са школы. Вучань 7 класа Онешчанка быў выключан са школы за тое, што ён у сваім выступленні адзначыў аб дрэнным матэрыяле выкладання. Дрэнна працуе школьная сталовая, якасць абедаў кепская.

У стасеўскай няпоўнай сярэдняй школе, Лёзненскага раёна, зусім няма чулых адносін да дзяцей. Асабліва груба адносіцца да вучняў настаўніца т. Новікава. На вучня Шыракова яна крычала: «Што ты стаіш як слуп асінавы». Вучаніцу абазвала «княжыцчай».

Гэтыя факты сведчаць аб непадрыхтаванасці раду школ да вучобы, аб нячулых адносінах да дзяцей з боку настаўнікаў. Раённыя аддзелы асветы павінны зараз-жа ўзяцца за ліквідацыю ўсіх гэтых прарываў, каб сапраўды зрабіць совецкія школы ўзорнымі ачагамі выхавання нашага малалога пакалення.

У ДАПАМОГУ ПРАПАГАНДЫСТУ

ПОДЛЫЯ ЗДРАДНІКІ І ДЭЗЕРТЫРЫ ОКЦЯБРСКАЙ РЭВОЛЮЦЫІ

Даны артыкул, як і артыкул ад 18 снежня,—з серыі, прысвечанай былой зіноўеўскай антыпартыйнай групе і яе падонкам

Не бескарысна ўспомніць павучэнні Зіноўева і Каменева ў 1917 годзе, калі партыя большэвікоў пад кіраўніцтвам Леніна і Сталіна падрыхтоўвала перамогу Окцябрскай сацыялістычнай рэвалюцыі.

У першым «Письме издалека», напісаным зараз-жа пасля Лютаўскай рэвалюцыі, Ленін пісаў: «Першая рэвалюцыя, народжаная сусветнай імперыялістскай вайной, разразілася. Гэта першая рэвалюцыя напэўна не будзе апошняй...», і Ленін намячаў геніяльны план тактыкі пролетарскай партыі.

«Рабочыя, вы праявілі цуды пролетарскага народнага гераізму ў грамадзянскай вайне супроць дарэчма, вы павінны праявіць цуды пролетарскай і агульнанароднай арганізацыі, каб падрыхтаваць сваю перамогу ў другім этапе рэвалюцыі» — пісаў Ленін у гэтым-жа пісьме. Падрыхтоўка перамогі рабочага класа, пераход ад буржуазна-дэмакратычнай да сацыялістычнай рэвалюцыі — такая задача, геніяльна сфармуляваная Леніным.

Партыя згуртавалася вакол гэтай праграмы Леніна. На чале рабочага класа партыя паслядоўна ажыццявіла гэты ленінскі план, забяспечыла перамогу Окцябрскай сацыялістычнай рэвалюцыі і ўстаноўленне дыктатуры пролетарыята.

Зіноўеў і Каменеў выступілі супроць ленінскага плана. Яны паклёпніцкі сцвярджалі, што арганізацыя мас на барацьбу за заваяванне дыктатуры пролетарыята з'яўляецца авантурызмам.

Тактыку Леніна-Сталіна, прынятую і праведзеную ўсёй партыяй, тактыку заваявання і выхавання мас у духу пераможнай сацыялістычнай рэвалюцыі, тактыку ізаляцыі буржуазных і дробна-буржуазных партый і вызвалення мас з-пад іх уплыву Зіноўеў і Каменеў называлі тактыкай расколу, тактыкай гібелі заваявання рэвалюцыі. Замест яе Зіноўеў і Каменеў прапаноўвалі братанне з левабуржуазнымі і дробна-буржуазнымі партыямі, тактыку адзінага фронта з меншавікамі і эсэрамі на глебе буржуазнай дэмакратыі. Карацей кажучы: Зіноўеў і Каменеў прапаноўвалі ў процівагу Леніну-Сталіну спыніцца і застыць на буржуазна-дэмакратычным этапе рэвалюцыі.

«Што датычыць агульнай схемы таварыша Леніна, то яна прадстаўляецца нам непрыемлімай, паколькі яна выходзіць ад прызнання буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі закончанай і разлічана на неадкладнае перарастанне гэтай рэвалюцыі ў сацыялістычную». Так заявіў Каменеў на другі-ж дзень пасля апублікавання выдатных красавіцкіх тэзісаў Леніна. Зіноўеў і Каменеў вялі шалёную барацьбу супроць ленінскага плана на працягу ўсяго перыяда падрыхтоўкі Окцябрскай перамогі.

Вось некалькі фактаў.

На красавіцкай партыйнай канферэнцыі, дзе адбывалася рашаючая мабілізацыя партыі, Каменеў выступіў з суладдам супроць Леніна, адстойваючы буржуазна-ліберальныя погляды. Рад скандынаўскіх сацыялістаў прапанавалі склікаць у Стакгольме міжнародную сацыялістычную канферэнцыю з мэтай «націскаць» на ўрады ваюючых краін за хутчэйшае сканчэнне вайны. Тады збіраліся апартуністы меншавікі, сацыял-імперыялісты. Таму ЦК партыі па прапанове Леніна рашуча выказаўся супроць удзелу ў канферэнцыі. Каменеў тым не менш на пасяджэнні ВЦВК назваў гэта меркаванне зборышча сацыял-імперыялізма «сцягам барацьбы пролетарыята супроць імперыялізма» і разам з меншавікамі і эсэрамі заявіў супроць Леніна і партыі за пасылку дэлегатаў на канферэнцыю.

На рашаючым лёс Окцябрскай рэвалюцыі пасяджэнні ЦК штрэйкбрэхеры Зіноўеў і Каменеў галасавалі супроць паўстання. Гэта важнейшае гістарычнае рашэнне было прынята пры шалёным супраціўленні Зіноўева і Каменева. ЦК адначасова прыняў пастанову, забараняючую Зіноўеву і Каменеву выступаць публічна супроць гэтага рашэння. Не глядзячы на прамую забарону, Зіноўеў і Каменеў неадкладна надрукавалі заяву супроць Леніна, ЦК і ўсёй партыі ў газеце «Новая жизнь», якая ішла рука ў руку з буржуазіяй. Там яны выдалі ўсёй буржуазіі сакрэтнае рашэнне ЦК аб узброеным паўстанні, прычыніўшы тым самым агромадную шкоду партыі і рабочаму класу. Ленін з поваду гэтага пісаў: «Каменеў і Зіноўеў выдалі (курсіў Леніна.— Рэд.) Расейскі і Кераванскаму рашэнне ЦК сваёй партыі аб узброеным паўстанні і аб утойванні ад ворага падрыхтоўкі ўзброенага паўстання, выбару тэрміна ўзброенага паўстання. Гэта факт, ніякімі ўвёртканні нельга абвергнуць гэтага факта. Два члены ЦК кляўзнай хлусёй перад капіталістамі выдалі (курсіў Леніна. — Рэд.) ім рашэнне рабочых. Адказ на гэта можа і павінен быць адзін: неадкладнае рашэнне ЦК: «Прызначыць поўны састаў штрэйкбрэхерства ў выступленні Зіноўева і Каменева ў непартыйным друку, ЦК абодвух выключае з партыі».

Подлая здрада Зіноўева і Каменева не асталася без рэзультатаў: 24 кастрычніка, напярэдадні назначанага тэрміна паўстання, Керэнскі сказаў у прадпарламенце крыважэрную прамову, у якой пагражаў агнём і мячом знішчыць большэвікоў. Войскі часовага ўрада ў тую-ж ноч былі пасланы для заняцця памяшкання большэвіцкіх цэнтраў і газет.

Калі рабочыя масы Пітера пад кіраўніцтвам партыі Леніна-Сталіна ў окцябрскіх баях штурмавалі цвярдыні буржуазна-памешчыцкай улады і зацвярджалі сваю дыктатуру, Зіноўеў і Каменеў сядзелі ў абозе, як дэзертыры і прамыя шкоднікі ўзброенага паўстання. «У тым-то і заключаецца бязмерная подласць, сагруднае здрадніцтва абодвух гэтых асоб (г. зн. — Зіноўева і Каменева.— Рэд.), што яны перад капіталістамі выдалі план стачачнікаў» — пісаў Ленін у пісьме ў Цэнтральны Камітэт партыі.

Але здрадніцкая барацьба Зіноўева і Каменева супроць партыі і супроць пераможнай рэвалюцыі на гэтым зусім не скончылася. Яна прадаўжалася з меншай сілай літаральна на другі-ж дзень пасля перамогі Окцябра. Гераічнай барацьбой рабочых мас пад кіраўніцтвам партыі ўлада была заваявана. Замест таго, каб неадкладна прызнаць сваю ракавую памылку і выправіць яе ў радах партыі пад кіраўніцтвам Леніна, прыкладаючы ўсе сілы да ўмацавання гэтай новай, крывёй рабочых і сялян заваяванай, улады, замест усяго гэтага штрэйкбрэхеры і дэзертыры Зіноўеў і Каменеў прапаноўвалі і актыўна дамагаліся... здачы гэтай улады буржуазіі.

Пасля перавароту меншавікі і эсэры прабавалі знішчэньлць перамогу рэвалюцыі шляхам стварэння замест новага рэвалюцыйнага ўрада, узначальваемага Леніным, так званай «Адзінай сацыялістычнай улады», у склад якой уваходзілі-б усе так званыя сацыялістычныя партыі.

Яны патрабавалі згоды ўсіх сацыялістычных партый. Папярэдняй умовай такой згоды і стварэння адзінага ўрада меншавікі і эсэры высоўвалі патрабаванні: поўнае разбраенне большэвікоў, знятне ўзброенай барацьбы, роспуск ваенна-рэвалюцыйнага камітэта, перадача большэвіцкіх узброеных сіл у распарадзенне згодніцкай гарадской думы, забеспячэнне меншавікам і эсэрам большасці ў складзе ўрада і, перш за ўсё, патрабаванне ўстранення Леніна з паста старшыні ўрада. Нічога чаго дказваць, што па злучнасці ўсе гэтыя патрабаванні азначалі аддачу класавым ворагам толькі што заваяваных пазіцый.

Зіноўеў і Каменеў змагаліся супроць Леніна і партыі за стварэнне такога ўрада. Калі ЦК па прапанове Леніна прыняў пастанову аб спыненні перагавораў з гэтымі партыямі, якія Ленін разглядаў не як самамэту, а толькі як «дыпламатычнае прыкрыццё ваенных дзеянняў», Зіноўеў і Каменеў разам з групай падтрымліваўшых іх тады правых членаў ЦК падалі заяву аб сваім выхадзе са складу ЦК партыі. Гэта быў далейшы крок дэзертырства і здрады. Каменеў пры поўным падтрымліванні Зіноўева на пасяджэнні ВЦВК процістаўставіў ленінскай рэзалюцыі большэвікоў сваю згодніцкую, за якую галасавалі некаторыя дробнабуржуазныя партыі.

Партыя, кіруемая Леніным і Сталіным, не пагадалася ніякаму ультыматуму групкі штрэйкбрэхераў. У адказ на ультыматум Зіноўева, Каменева і іншых ЦК партыі апублікаваў адказ да ўсёй партыі і ўсіх працоўных, у якой гаварылася: «Няхай-жа засаромеюцца ўсе маловеры, усе хістаючыяся, усе сумніваючыяся, усе дапушчы сябе запалохаць буржуазіі або пагдаваўшыяся крыкам яе правых і ўскосных дапамоснікаў. Ні цені хістанняў у масах петраградскіх, маскоўскіх і другіх рабочых і салдат няма. Наша партыя стаіць дружна і цвёрда, як адзін чалавек, на варце совецкай улады, на варце інтарэсаў усіх працоўных».

Зіноўеў і Каменеў былі адхілены па настаянню Леніна ад партыйнага кіраўніцтва і ўсякай партыйнай работы. Каменеў быў адкліканы з паста старшыні ВЦВК, месца якога заняў Я. М. Свердлаў. Ад [illegible] і любезных пацалункаў Каменева з купцамі ў Ачынску пасля Лютаўскай рэвалюцыі, праз прывітальную тэлеграму прастолапаследніку Міхаілу Раманаву, адпраўленую Каменевым, — да ганебнага дэзертырства і прамой здрады ў дні Окцябра, да патрабаванняў здачы заваяванай улады, да згодніцкай кухні з меншавікамі і эсэрамі, у якой з такой ганьбай падпіхаўся Зіноўеў, — такі шлях і такая роля Зіноўева і Каменева ў 1917 годзе.

Ленін недарма гаварыў: што памылкі Каменева і Зіноўева ў 1917 г. не выпадковыя. Увесь далейшы шлях гэтых штрэйкбрэхераў поўны здрадніцтваў. Рукамі тройчы праклятых падонкаў былой зіноўеўскай антыпартыйнай групы выкінуты з нашых радоў таварыш Кіраў. Гэта контрэвалюцыйнае ахвосце зіноўеўшчыны ў звярынай нянавісці да партыі і рабочага класа пераклікалася з зарубежнай белагвардзейшчынай, якая яшчэ ў газеце «За Россию» (выдаецца ў Белградзе) да забойства правадыра, у прыватнасці да забойства таварыша Кірава, аб чым падрабязней мы сёння расказваем на 4-й старонцы ў артыкуле «Разбойничье гнездо в Белграде».

(«ПРАВДА»).

14 турбін розной магутнасці (3000 — 12000 кіловат) выпускае завод імя Кірава («Красный путиловец», Ленінград) у IV квартале. На здымку: праверка рэтатар» да турбіны.

Агляд друку

ПАСЛЯ ВЫБАРАЎ

Старшынёй Пустынскага сельскага совета т. Белкоўскі выбран зусім нядаўна. 9 снежня ён прыйшоў на з'езд советаў свайго Сенненскага раёна ў Беларусі паўнамочным дэлегатам з правам пастаноўчага голасу. Не зусім звычайнай была яго прамова.

«Таварышы! У маім жыцці адбылася вялікая перамена. Мне, яшчэ ўчора радавому калгаснику, аказалі вялікае давер'е. Мяне выбралі старшынёй сельскага совета.

Утойваць не стану. Я ганаруся тым, што калгаснікі і працоўныя аднаасобнікі даверылі мне такі адказны пост, што партыйная арганізацыя рэкамендавала мяне, і паверце, пастараюся працаваць па-ўдарнаму, па-большэвіцку. Але я патрабую дапамогі ад сваіх выбаршчыкаў і падтрымання раённых арганізацый.

Аб сельскіх советах тут гаварылі нямала. Мяне гэтыя словы не супакоілі, бо ніхто не адзначыў, якая небяспека падсцерагае нас. Раённая газета «Комунар» у справаздачы аб з'ездзе піша:

«У спрэчках многа ўвагі было ўдзелена справе замацавання кадраў сельскіх советаў».

«Многа ўвагі ўдзелена» — гэта сказана па прывычцы ці проста для краснага слоўка. Так, вялікая цікавасць сярод работнікаў сельскіх советаў. Але чыя тут віна?

Возьмем, напрыклад, нашу паважаную раённую газету «Комунар». З намі газета размаўляе злосна, не па-таварыску. Яна не вучыць, як выправіць памылку, як лепш працаваць, а стараецца толькі найбольш злосна, найбольш лёстка вылаяцца.

«Лепшых людзей калгаснай вытворчасці, ударнікаў социялістычных палёў — вось каго пасылаюць выбаршчыкі ў новы склад советаў».

20 лістапада ва ўсіх сельскіх советах нашага раёна адбыліся першыя арганізацыйныя пленумы. У той-жа дзень члены Ходчанскага сельскага совета, якія сабраліся на першы пленум, прачыталі ў «Комунары» аб тым, што:

«кіраўнікі Ходчанскага сельсовета нядольны арганізаваць масы».

Гэта яшчэ толькі затрашка, толькі сігнал. Назаўтра здзіўленыя калгаснікі чыталі ў раённай газеце радкі, аблямаваныя чорнай рамкай:

«Ганьба Пустынскаму, Новасельскаму, Падворыцкаму, Ульянаўскаму, Беліцкаму, Аляксініцкаму, Гарывецкаму і Ходчанскаму сельсоветам!

Выключна з-за вас, кіраўнікі і члены гэтых сельсоветаў, раён ганьбна зрывае выкананне плана калізацыі сродкаў і знаходзіцца на 71 месцы па БССР».

Я пытаю вас, таварышы, чым заслужыў я публічную ганьбу? І можна так лёгкавумна ганьбаваць «лепшых людзей калгаснай вытворчасці, ударнікаў социялістычных палёў», выбраных яшчэ 10 назад у органы пролетарскай дыктатуры? Я думаю, таварышы, што ганьбаваць трэба рэдакцыю, якая так неразумна паступае. Прашу рэдактара, які прыехаў тут на з'езд, не прыязджаць.

Раённы камітэт партыі заахвочвае негодныя метады работы раённай газеты. Сам раённы камітэт паказвае нядобры прыклад грубым адносінам.

24 лістапада Сенненскі раённы камітэт партыі і раённы выканаўчы камітэт абмеркавалі ход выканання пастановы і пастанавілі:

«Канстатаваць поўны зрыў выканання мясапаставак па сельсоветах:

Бельскаму, Бушскаму, Машчанскаму, Пустынскаму, Расоншскаму, Сідорніцкаму і Ульянскаму, дзякуючы злачыннай бяздзейнасці старшынь гэтых сельсоветаў».

Выходзіць, што сельскія советы новага складу балбочуць, злачынна бяздзейнічаюць, ліберальнічаюць з сабатажнікамі, ганьбяць раён. І як сабатажнікаў, бяздзейнікаў, нас кляймяць ганьбаю, ужо аб'яўляюць суровыя вымовы і нават аддаюць пад суд.

Вы падумайце толькі. Сельскія советы новага складу працуюць менш двух тыдняў. Але ўсё яны са старонак раённай газеты ўжо абстраляны, аблаяны. Куды-ж гэта галіцца? Хіба можна так лёгкадумна адносіцца да органаў дзяржаўнай улады? Хто-ж у сяле пасля гэтага будзе паважаць кіраўнікоў сельскага совета?

Верна: многа сельскіх советаў яшчэ працуе дрэнна, адмаўляць гэтага нельга. Бываюць і памылкі, і нямала недахопаў. За гэта трэба нас, і старых і новых, старшынь сельскага совета, крытыкаваць па-дзелавому, строга, без усякай «скідкі», але і без крыклівасці і незаслужаных знаваг. Не трэба рубіць з пляча, адразу валіць у кучу ўсіх і правых і вінаватых.

Я хачу, каб нашы сенненскія раённыя арганізацыі, нарэшце, зразумелі, што трэба яшчэ многа і цярпліва вучыць нас культурна працаваць. У нас многа сіл і энергіі. Дайце нам таварыскую дапамогу, і мы выканаем усе заданні, усе ўказанні нашай роднай комуністычнай партыі і совецкай улады.

Вось і ўсё. Таварышы, я скончыў».

Невядома, ці сказаў у сапраўднасці тав. Белкоўскі гэту прамову 9 снежня на сенненскім раённым з'ездзе советаў. Але гэта не мяняе сутнасці справы. Тав. Белкоўскі — не выдуманая намі фігура, а жывы чалавек, сапраўды новы старшыня Пустынскага сельскага совета, які адчуў на сабе ўсю пекнату газетнага і адміністратыўнага аўтаматызма і крыклівасці сенненскіх раённых арганізацый.

За 10 дзён свайго прабывання ў сельскім совеце ён паспеў папасці ўжо на чорную дошку, быў два разы ахаяным у друку, атрымаць клічкі «ліберала» і «злачыннага бяздзейніка». Выбары сельскія советы заканчваюцца, кожны дзень газетная пошта дастаўляе ўсё больш прыкладаў горача, з энтузіязмам пачатай работы сельскіх советаў новага складу. Але энтузіязм гэты нярэдка гасіцца ў самым пачатку тымі раённымі арганізацыямі і раённымі газетамі, якія не адвучыліся ад бюракратычных метадаў, «выхавання» і «кіраўніцтва». Сям-там нават пераплюнулі сенненскую газету. Так, 29 ліста пада енатаеўская раённая газета (Сталінградскі край) «Колхозный путь», захлёбваючыся ад захаплення, апісвае злёт ударнікаў фінансавага плана:

«Пад гучны смех і ігру аркестра «Чыжык, чыжык, дзе ты быў?» — уручаецца жэтон чарапахі Грачаўскаму сельсовету. Кандыдатамі на атрыманне рагожнага сцяга зносяцца сельсоветы: ГРАЧАЎСКІ, КОСІКІНСКІ, ФЕДАРАЎСКІ І ВЛАДЗІМІРСКІ».

Ігра аркестра заглушыла ўсё — і чуласць, і здаровы сэнс. І палітычны такт. Праз некалькі дзён пасля выбараў Енатаеўскі раённы камітэт партыі, раённы выканаўчы камітэт і рэдакцыя накідваюць публічнае пасмяшышча новых советаў. Рагожы ў Енатаеўску хапіла-б не толькі для работнікаў сельскага совета, але і для раённых кіраўнікоў. Але рагожным маскарадам нельга прыкрыць палітычную блізарукасць і ўласнае няўменне працаваць.

(«Правда»).

НЕВЫЧАРПАЛЬНЫЯ МАГЧЫМАСЦІ

(АБ РАЗГОРТВАННІ САМАТУЖНАЙ ВЫТВОРЧАСЦІ У КАЛГАСАХ)

НА ШТО СКАРДЗІЦЦА тав. ПАЛЯНКОВА

Лепшая ўдарніца калгаса «Зорка 1 мая», Горацкага раёна, тав. **Палянкова скардзіцца:**

— Як толькі настае зіма, то неяк робіцца сумна. Работы няма. Прыдзеш раніцой на нарад, пастаіш гадзіну-другую і так, не дачакаўшыся працы, ідзеш дадому.

Такіх «беспрацоўных», як Палянкова, у калгасе «Зорка 1 мая» набярэцца больш двух дзесяткаў, а такіх калгасаў, дзе ўдарніцы «сумуюць», у Горацкім раёне балай больш сотні. І гэта не выпадкова. Вось паказальныя даныя з сярэдняга па насычанасці рабочай сілай калгаса імя Кірава. Тут за год выпрацавана 38 тысяч працадзён. Прычым на летнія месяцы (з 1 красавіка па 1 лістапада) прыпадае па 4 тыс. працадзён, а на зімовыя—толькі па 2 тыс. Да гэтага трэба дадаць яшчэ і тое, што пераважная большасць працадзён, асабліва зімою, налічваецца мужчынам. Апошняя акалічнасць тлумачыцца тым, што ў гэтым калгасе, не гаворачы ўжо аб такіх работах, як вывазка лесу, або торфу і т. д., мужчыны (іх тут 38) працуюць на ўсіх унутрыкалгасных гаспадарчых і адміністрацыйных работах: два на МТФ, сем конюхаў, брыгадзір, рахункавод, кладаўшчык і т. д. А вось з 70 жанчын наўрад ці 20 проц. маюць у зімовы час работу.

У калгасе «Чырвоны сцяг»—80 мужчын, з іх 9 працуюць на канюшні, 8 у МТФ, 5 у калгасным млыне, 5 вартаўнікамі, 4 на адміністрацыйных работах, 4 у цяслярскай брыгадзе, два на «розных работах», 30 некаторы час працуюць на лесавывазцы, а астатнія 13 на працяту амаль пяці месяцаў не выкарыстоўваюцца. Гэта значыць, не выкарыстоўваецца каля двух тысяч чалавекадзён.

Такіх прыкладаў вельмі багата. І ўсе яны сведчаць аб тым, што ў зімовы час рабочая сіла ў калгасах Горацкага раёна выкарыстоўваецца зусім нерацыянальна, што ў выніку гэтага значна знижаецца вага працадня і такім чынам пераважная большасць калгаснікаў не маюць магчымасці пасля сканчэння летне-асенніх работ змагацца за палепшэнне свайго матэрыяльна-бытавога становішча, за гаспадарчае ўмацаванне і таварнасць калгасаў.

Зараз у сувязі з ліквідацыяй картачнай сістэмы на хлеб і іншыя прадукты, у сувязі з далейшым разгортваннем совецкага гандлю, для калгасніка асабліва важнае значэнне набывае грашовая частка працадня. Між тым у значнай частцы калгасаў раёна грошай на працадзень калгаснікі не атрымліваюць. У Карэпскім сельсавеце за ўвесь час існавання калгасаў ні адзін калгаснік не атрымаў на працадзень грошай. Тут, як правіла, усе грашовыя калгасныя даходы залічваюцца ў непадзельны капітал.

Пасля ўсяго гэтага не цяжка зрабіць вывад—перад раённымі кіруючымі арганізацыямі стаіць як адна з асноўных задач—правільна арганізаваць і спланаваць работу ў калгасе на круглы год, каб упікнуць шкодны традыцыйнай сезоннасці ў рабоце. І сапраўды, калі правільна спланаваць такія работы, як лесавывазка, догляд жывёлы, калгаснае будаўніцтва і інш. звычайныя работы, то ў калгасах застанецца шмат вольнай рабочай сілы, якую можна з поспехам скарыстаць на пабочных унутрыкалгасных прадпрыемствах: бандарная справа, выраб калёс, валёнак і т. д. Гэта дало-б магчымасць калгасу рабіць каштоўную прадукцыю шырокага ўжытку для рынка і гэтым самым павялічыць грашовую частку працадня, павысіць пакупную здольнасць калгаснікаў, палепшыць іх добрабыт.

Між тым у раёне ніхто гэтым не займаўся і не займаецца. Чаму? Адказ следуе такі: «У нас калгаснікі акрамя галавых работ і догляду жывёлы нічога не ўмеюць рабіць». Па справе-ж мы маем зусім адваротнае. **Возьмем для прыкладу Пакуцянскі сельсовет.** Тут вольнай рабочай сілы ў зімовы час ёсць нямала ў кожным калгасе. Нават у такім, як «VI з'езд советаў», дзе на 43 гаспадаркі прыпадае звыш 600 га зямлі. Тут цэлае лета працуе арганізаваная брыгада з 4-5 калгаснікаў, якая выробляе калёсы звычайна для патрэб калгаса. А зімою амаль у кожнай калгаснай хаце—калёсная майстэрня. Прычым гэта ўжо не арганізаваная праца. **Кожны калгаснік сам сабе здабываў матэрыял, сам працуе і сам прадае выробленую прадукцыю на рынку, ці па заказу ў суседнім калгасе.** Трэба адзначыць, што гэта праца працягае не ў рабочы час. Такім чынам адны калгаснікі працуюць у калгасе днём, а вечарамі ў сябе ў хаце, а другія — зусім не маюць работы.

У калгасе «Колас», Карэпскага сельсовету, 12 мужчын знаходзяцца пастаянна ў адыходзе цэлы, а чалавек 20 — спецыялісты-шапавальшчыкі,—пачынаючы з пачатку снежня да 5-10 студзеня ходзяць па вёсках свайго раёна, а таксама **Заходняй вобласці на заработкі.** Астатнюю-ж частку года яны «вылежваюцца».

Такіх прыкладаў можна было-б прывесці безліч. І ўсё-ж раённыя арганізацыі—ні РК КП(б)Б. ні РВК, ні райза, ні МТС — гэтым пытаннем не займаюцца і не лічаць патрэбным арганізаваць гэту справу, хоць у некаторых калгасах, каб можна было перанесці іх вопыт у другія гаспадаркі.

Асабліва дрэнна абстаіць справа ў зімовы час з арганізацыяй жаночай працы. Тут імкнуцца вытлумачыць гэта тым, што ў раёне распаўсюджана хутарская сістэма, што жанчыны не ўмеюць выробляць калёс, бочак і т. д. Але гэтыя тлумачэнні нічым неўтрутаваны. Справа ў тым, што ў большасці калгасаў зімою жанчыны зусім не нагружаны, а мужчыны выкарыстоўваюцца вельмі нерацыянальна. Напрыклад, у калгасе «Сталінскі прызыў», Шарыпскага сельсовета, каля калгасных коней працуе 9 здаровых, працаздольных мужчын. А вось у калгасе «Чырвоны стралок», Дрыбінскага сельсовета, на канюшні працуюць выключна жанчыны на чале са старшым конюхам Ціханавай, якія вельмі добра спраўляюцца з даручанай ім справай.

Чаму-б не скарыстаць гэты вопыт у іншых калгасах і гэтым самым не стварыць рэзерв мужчынскіх рабочых рук, скарыстаўшы гэты рэзерв на арганізаваных саматужна-падсобных прадпрыемствах у калгасе.

Трэба сказаць, што адсутнасць увагі да арганізацыі рабочнай працы ў калгасах паслужыла тормазам калектывізацыі ў радзе вёсак раёна. Так, у вёсцы Машкова і Абрамаўка, дзе найбольш развіта бандарства і калёсніцтва, дзе гэта работа адыгрывае значную ролю ў бюджэце селяніна, да гэтага часу не было калгаса і ні аднаго калгаснка. І ёсць пагроза, калі гэта работа і зараз тут не будзе арганізавана, то гаварыць аб сур'ёзным замацаванні гэтых калгасаў наўрад ці будзе магчыма.

Усе гэтыя факты павінны паслужыць сур'ёзным сігналам для раённых кіруючых арганізацый. Трэба неадкладна ўзяцца, па-першае, за планаванне калгаснай вытворчасці ў зімовы час, за такое планаванне, якое мае месца ў калгасах вясной, летам і восенню. Падругое, трэба арганізаваць адыходніцтва і калгасных адз ночак-саматужнікаў у спецыяльныя брыгады, арганізаваць пры калгасах майстэрні, дапамагчы калгасам аўладаць гэтай справай. Усё гэта адыграе вызначальную ролю ў стварэнні большэвіцкіх калгасаў, у забеспячэнні заможнага жыцця калгаснікаў.

ВІТ. ДАЛЬ.

КРЫНІЦА ВЯЛІКІХ ПРЫБЫТКАЎ

Сельска-гаспадарчы год закончан. Наступіла зіма. У калгасах думаюць: гэта пара адпачынку, у гэты час можна нічога не рабіць. На зімовы перыяд у некаторых калгасах дэмабілізуюцца нават па навыя брыгады, адпачываюць і брыгадзіры разам з калгаснікамі, калгаснікамі. На сваім пасту асноўцца толькі жывёлагадоўчыя брыгады ды некалькі звеньяў вывазчаецца на лесавывазку.

Ці сапраўды зімой няма чаго рабіць у калгасе? Не, зусім не.

З вялікай карысцю ў зімовы вольны час можна скарыстаць рабочую сілу калгасаў на вырабе калёс, саней, бочак, дзежак, лыжак, глінянай пасуды і т. д. У гэтым інвентары не толькі вёскі але і горад маюць вялікую патрэбу.

Прывядзем такі прыклад. Мінулая восень была надзвычай багата гароднінай. На калгасных базарах прадавалася капуста па 1 руб. за пуд. А між тым яе купілі вельмі мала. Чаму? Таму, што няма дзе купіць дзежку для закваскі капусты. Тое-ж было з агуркамі.

Нечага ўжо гаварыць аб попыце на такія важныя рэчы, як калёсы і сані. Вось гэта я рэчы могуць і павінны вырабляць калёсы зімой. Для гэтага і майстроў і матэрыялу амаль у кожным калгасе, сельсавеце больш чым даволі. Што гэта так, пакажам на прыкладзе калгасаў Аршанскага раёна.

Вось калгас «Новае жыццё», Клюкаўскага сельсовета. Тут раней у масавым парадку выраблялася ганчарная пасуда—міскі, гаршкі, стаўбуны. Тут выраблялі сані, калёсы. Тут дралі шчапу для дахаў. Тут, нарэшце, вялікія запасы торфу. Можна было і яго здабываць.

Старшыня калгаса т. Харонь гаворыць:

— База ў нас вялікая. Гліны запас незлічоны. Можна выраблять не толькі пасуду, але і чарапіцу і цэглу. На жаль, мы зараз ні чога не выробляем... А майстроў шмат. Яны часова прыстроіліся на работу ў лесапрамгас...

Такое-ж становішча і ў калгасе «Піонер»: тут выраблялі раней гліняную пасуду, зараз хочуць выробляць чарапіцу, цэглу, але... справа не ладзіцца.

У калгасах «Чырвоная Проня», «1 мая», «Чырвоная зорка». Радакоўскага сельсовета, самі па сабе калгаснікі выробляюць гонты, возяць на базар і прадаюць па 3 рублі капу. У калгасах імя Сталіна і «Шлях да социялізма», гэтага-ж сельсовета, таксама адзіночкі-калгаснікі выробляюць бочкі, дзежкі, начоўкі і прадаюць на базары.

У калгасе «Верны шлях» самы прымітыўным спосабам калгаснікі выробляюць сані.

Гэтыя адзіночкі-саматужнікі, як правіла, крадуць дзяржаўны лес і робяць бочкі, сані і калёсы па ночах.

А ў калгасе «Маяк комуны», Высоцкага сельсовета, ёсць добрыя майстры, якія могуць рабіць не толькі калёсы і сані, але і шафы, камоды, сталы, чамаданы.

На жаль, уся гэта вялікая армія калгасных майстраў шаф і камодаў, саней і калёс, дзежак і лыжак не арганізавана, працуе ў рознабой, рыўкамі, а значная частка і зусім не працуе.

Дарэмна марнуецца час, працяць ад гэтага не толькі калгаснікі, калгасніцы і калгасы ў цэлым. Гаворыць старая прывычка: «Пад ляжачую калоду вада не коціцца».

Ніхто ў раёне — ні райком, ні райвыканком, ні райза — не патурбаваўся, каб арганізаваць калгаснікаў на карыснае скарыстанне вольнага зімовага часу ў калгасах.

А між тым, які вялікі прыбытак ад саматужна-прамысловых гал можа мець калгас.

Падамо адзін прыклад. У калгасе «Чырвоная зорка», Высоцкага сельсовета, спецыяльная калгасная прамарцель выробляе сані, калёсы, абады, дугі, венікі, мётлы. **Члены гэтай калгаснай промарцелі ў зімовыя месяцы, з лістапада да красавіка, зарабляюць у сярэднім па 100 руб. у месяц на чалавека.** Тысячы грошай ідуць не ў аўульна-калгасныя патрэбы.

Здавалася-б, гэты прыклад трэба было шырока распаўсюдзіць у раёне і арганізаваць у дзесятках калгасаў такія-ж прамарцелі.

А. МІКУЦКІ.

Пісьмы рабочых і калгаснікаў

ПРАКУРОРУ БАРЫСАЎСКАГА РАЁНА тав. КОЦІКУ

ЖУЛІК ФАЙНДМАН АБКРАДВАЕ СЕЛЬПО

(ПІСЬМО РАБКОРА)

У Адзерскім сельпо, Барысаўскага раёна, у вёсцы Чарняўцы прадаўцом працуе Файндман. Ён сістэматычна абкрадвае пайшчыкаў і разбазарвае тавары.

Пайшчык Лібенсон хацела купіць кілограм цукру. Файндман патрабаваў ад яе паміма грошай яшчэ 5 яек. Сялянцы з вёскі Прупка за 5 яек ён даў лыжку соды без вагі. А сода каштуе толькі 28кап. кілограм!

Файндман закупкай хлеба не займаецца. Тавар, вызначаны на закупку, ён раздае сваякам і знаёмым. Напрыклад, намесніку старшыні сельпо Жукоўскаму даў 5 аўчын, сястры старшыні сельпо Свіроўскай — 6 кілограм цукру па цвёрдай цане, загадчыку млына Семчанку адпусціў 2 кілограмы селядцоў без пая.

Файндман трымае цесную сувязь з загадчыкам крамы Белгандля Альперыным, якому перадае розныя тавары з фондаў стымулявання для продажу па камерцыйнай цане, а розніцу яны дзеляць паміж сабой.

Старшыня сельпо Свірноўскі падае аб усіх злачынствах Файндмана, але пакрывае яго.

Розным злачынствам спрыяе адсутнасць уліку і бяздзейнасць ревізійнай камісіі.

Не выпадкова, што сельпо закупіла хлеба менш паловы таго, што мерквала.

АЛЕШКА А.

ДЫРЭКТАРУ БЕЛДЗЯРЖТРАНСА тав. ХМЕЛЮ

ПАЎТУТЫ ПАСАЖЫРАЎ

(ПІСЬМО ПАСАЖЫРАЎ)

Менскае аддзяленне Белдзяржтранса дрэнна арганізавала аўтобусны рух паміж Менскам, Беразіно, Чэрвенем і Лагойскам. Пасажырам, каб трапіць у аўтобус, трэба шмат памучыцца.

Білетная каса не абсталявана, памяшкання для чакання няма, прыходзіцца мерзнуць на дварэ па 5 і больш гадзін.

Расклад руху аўтобусаў сістэматычна парушаецца. Так, 8 снежня аўтобус на Чэрвень адправіўся ў 3 гадзіны 30 мінут дня замест 8 гадзін раніцы, 9 снежня — у 12 гадзін дня. Касір Чабан, ён-жа кантралёр, заўсёды спазняецца на работу; замест 7 прыходзіць у 8 гадзін. Пры продажы білетаў чаргі ён не захоўвае, а прадае ў першую чаргу знаёмым.

Менскае аддзяленне Белдзяржтранса павінна неадкладна палепшыць работу аўтобуснага парка.

ГУРЗВІЧ, ЛУЦЗВІЧ, РОЗУМ, АЛЕКСАНДРОВІЧ (усяго 5 подпісаў).

САКРАТАРУ МАГІЛЕЎСКАГА РК КП(б)Б тав. РЭВІНСКАМУ.

„РАЙПРОФСОВЕТ ДЛЯ НАС НЕ ЗАКОН"

(ПІСЬМО СЛУЖАЧАГА).

Загадчык дамамі жакта № 5 у Магілеве Сафонаў сістэматычна п'янствуе і зусім не цікавіцца рамонтам кватэр.

У доме № 66 разбураны дымаходы печаў, пліты па кухні палаваны, зімой замярзае водаправод, у вокнах замест шкла тырчаць анучы.

У доме № 68 печы неспраўныя дах цячэ, вокны палаваны.

Райпрофсовет прапанаваў жакту неадкладна прыступіць да рамонту дамоў. Старшыня жакта Левінаў і загадчык Сафонаў у адказ на гэта заявілі: «Райпрофсовет для нас не закон, рамонт рабіць не будзем і нічога нам ніхто не зробіць».

МАЖАЕКІН.

СТАРШЫНІ ЖЛОБІНСКАГА РВК тав. АДАМЧУКУ

КУЛАКОЎ ВЫЗЗАЛІЛІ АД ДЗЯРЖ ЎНЫХ ПЛАЦЯЖОЎ

(ПІСЬМО СЕЛЬКОРА)

Старшыня Казіміраўскага сельсовета (Жлобінскі раён) Спевак з сакратаром Верамейчыкам вызваляюць ад дзяржаўных паставак плацяжоў кулацкія гаспадаркі і гаспадаркі служак рэлігійнага культу.

Так, вызвалены ад плацяжоў і не здаюць ні хлеба, ні малака былыя служкі рэлігійнага культу Юхневіч і Кічыла. А яны маюць кароў і намалацілі сотні пудоў хлеба.

Вызвален ад падатку і Пацярухін, які мае 8 гектараў зямлі.

Чаму ён вызвалены? Таму, што брат яго працуе ў сельсавеце і сістэматычна п'янствуе з сакратаром сельсовета Верамейчыкам.

РВК павінен завяшчы гэтай справай.

ГОВАР Н. П.

САКРАТАРУ РЭЧЫЦКАГА РК КП(б)Б тав. МАЛІНІНУ

ЗЛОДЗЕІ ПРАЛЕЗЛІ Ў ПР ЎЛЕННЕ КАЛГАСА

(ПІСЬМО СЕЛЬКОРАЎ)

Старшыня калгаса «Іскра», Ровенска-Слабодскага сельсовета (Рэчыцкі раён), Бубенаў Ф., брыгадзір Сівухін С. і кладаўшчык Чорнашэй Ф. раскрадваюць калгасную маёмасць.

Бубенаў і Чорнашэй забралі з кладовай 2 мяшкі бульбы, паўтара пуда фасолі і пуда 2 шпаргалы. Кладаўшчык Чорнашэй прымаў збожжа з малатарні без уліку, і ніхто яго не правяраў. Старшыня рэўкамісіі А. Дворкін сам тры разы судзіўся за пагнаенне калгаснай бульбы і падробку дакументаў.

Брыгадзір Сівухін С. зусім заблытаў улік працадзён. Часта працадні не запісваліся па 2 месяцы. Сівухін самавольна змяншаў нормы выпрацоўкі—замест 0,70 га на ворыве запісваў 0,40 га.

А праўленне калгаса абараняе гэтых злачынцаў. Яно выключыла з калгаса селькора Кальчука, які пісай пра старшыню, і аштрафавала яго на 5 працадзён пасля таго, як заметка з'явілася ў газеце.

КАЛЬЧУК, МАЕЎСКІ.

НАЧАЛЬНІКУ ПАЛІТАДДЗЕЛА АРШАНСКАГА АДДЗЯЛЕННЯ МБВ ЧЫГУНКІ тав. КІРЫЛАВУ

ЗРЫВАЮЦЬ ПАДПІСКУ НА БЕЛАРУСКІЯ ГАЗЕТЫ

На 5 вагонным участку ст. Орша МБВ чыгункі ўпаўнаважаны па падпісцы на газеты працуе Галкоўская Ольга.

Калі рабочыя звяртаюцца да яе з просьбай выпісаць беларускія газеты, яна заўсёды адказвае: «Вы лепш выпіце маскоўскія газеты, я яшчэ не звязалася з Менскам».

Прыходзіцца за 3 кілометры хадзіць на станцыю, покуль атрымаеш беларускую газету. Бывае, што і на станцыі не знойдзеш ні адной менскай газеты.

КУЛЬБЕНАК.

НАМ ПІШУЦЬ

Селькор Мысалеевіч піша, што ў Мозыры так і па ўсяму раёну да гэтага часу школы малапісьменных не працуюць.

Загадчык райана і яго намеснік Падбярозны бяздзейнічаюць. Жадаючыя вучыцца астаюцца па-за школай.

* * *

У соўгасе «Ударнік», Скрытелаўскага сельсовета, Петрыкоўскага раёна, ёсць паравы млын. Але ён не працуе з-за нядбайнасці дырэктара соўгаса Барэйкіна, які не забяспечыў млын апалам. — пішуць селькоры Юніцкі і Вінакур.

* * *

Студэнт Мозырскага політэхнікума Маскалеевіч паведамляе, што ў інтэрнаце тэхнікума холадна, шыбы павыбіваны, сталоўкай студэнты не забяспечаны. Дырэктар тэхнікума і горсовет аб гэтым не клапоцяцца.

По следах выступленняў „Звязды"

„БЯЗДУШНЫЯ, ЗЛАЧЫННЫЯ АДНОСІНЫ ДА ЖЫВОГА ЧАЛАВЕКА"

Пачата следства па пісьму рабочага Якубовіча («Звязда» ад 16 снежня) аб агіднейшым факце грубага іграванняя інтарэсаў калгаснікаў, які меў месца ў калгасе «Зара Захода», Бораўскага сельсовета, Менскага раёна.

„ЦКОДНІКІ Ў КІРАЎНІЦТВЕ КАЛГАСА „УСХОД"

За раскрадванне калгаснай маемасці і шкодніцтва ў калгасе «Усход», Клінаўскага сельсовета, Дуброўенскага раёна («Звязда» за 24 жніўня), пракуратура рэспублікі аддала пад суд старшыню калгаса Карніцкага і рахункавода Бакчэва.

„БУДАЎНІЦТВА САРВАНА"

22 лістапада гэтага года «Звязда» пісала аб пагрозе зрыву будаўніцтва свінарнікаў, кароўнікаў і канюшань у соўгасе «Далёкая ніва». Зараз дырэктар магілеўскага трэста свінагадоўчых соўгасаў паведамляе рэдакцыі, што свінарнікі да зімоўкі былі падрыхтаваны, кароўнік прыстасаваны у сялянскім гумне, а канюшні ў двух сялянскіх хлявах. Кармушкі ў кароўніку, якія асталіся неабсталяванымі, і неацепленыя сцены і дзверы ў адной з канюшань зараз рэмантуюцца.

За рубяжом

Вялікі фашыскцкай рэакцыі ў Іспаніі.
Пад Мадрыдам адкрыт першы канцэнтрацыйны лагер, у якім пакутуюць сотні ўдзельнікаў рэвалюцыйнага руху — іспанскіх рабочых і сялян. НА ЗДЫМКУ: зварот зняволеных з прагулкі.

Прыгавор па справе фашыстаў-налётчыкаў

ЛОНДАН, 20 снежня. (БЕЛТА). Учора ў судзе слухалася справа фашыстаў, якія 23 лістапада зрабілі налёт на памяшканне «Дэйлі уоркер» і напалі на двух служачых газеты.

Фашысты абвінавачваліся ў нанясенні раненняў двум служачым і ў пашкоджанні маёмасці. Адзін з фашыстаў прыгавораны да двух месяцаў зняволення і штрафу ў 5 фунтаў стэрлінгаў, другі—да месячнага зняволення і штрафу ў 5 фунтаў стэрлінгаў.

ЗАМЕЖНЫ ДРУК АБ ФРАНКА-СОВЕЦКІМ СУПРАЦОЎНІЦТВЕ

ФРАНЦЫЯ

ПАРЫЖ, 20 снежня. (БЕЛТА). Увесь друк змяшчае тэкст франка-совецкага пратакола і паведамленне аб пачатку перагавораў і заключэнні франка - совецкага гандлёвага дагавора. Макс Гімаро (дэпутат і старшыня гандлёвай камісіі палаты) адзначае ў «Журналь дэ Комэрс», што ўпершыню за апошнія 10 год Францыя вядзе перагаворы аб заключэнні з Совецкім Саюзам тагавора такой важнасці.

ЧЭХА-СЛАВАКІЯ

ПРАГА, 20 снежня. (БЕЛТА). Газеты шырока публікуюць тэкст франка-совецкага пратакола, падкрэсліваючы выключную важнасць гэтай дэманстрацыі франка - совецкай дружбы. «Чэске слово» выказвае задавальнене па поваду своечасовага выступлення Чэхаславакіі, якая гарантавала сваё далучэнне да дзейнічаў Совецкага Саюза і Францыі. «Лідове новіны» падкрэслівае вялікае ўражанне, зробленае пратаколам на польскую грамадскасць.

АБСТРЭЛ СОВЕЦКІХ ПАГРАНІЧНІКАЎ З МАНЧЖУРСКАГА БОКУ

ХАБАРАЎСК, 19 снежня. (БЕЛТА). У канцы лістапада і ў пачатку снежня на ізяржаўнай граніцы СССР з Манжурыяй у раёне Благавешчэнска меў месца рад выпадкаў нічым не ўгрунтаванага, правакацыйнага абстрэлу совецкіх пагранічнікаў з манчжурскага боку. Так, напрыклад, 28 лістапада трыма невядомымі з манчжурскай тэрыторыі быў абстрэлен вінтовачны агонь і стрэламі совецкі пагранічнік Кармеў, які знаходзіўся на пасту на ахове дзяржаўнай граніцы ў 5 клм. ад сяла Бібікава (за 75 клм. ад Благавешчэнска).

2 снежня за 4 клм. ад сяла Верхне - Благавешчэнска стрэламі з вінтовак з манчжурскага боку абстрэлен вартавы абарончых пабудаванняў. Страляўшы схаваўся ў сошкі. 4 снежня каля Сахаляна з манчжурскай тэрыторыі быў абстрэлен совецкі вартавы.

Консул СССР у Сахаляне заявіў мясцоваму дыпламатычнаму агенту манчжурскага ўрада пратест супроць гэтых парушэнняў непарушнасці совецкай дзяржаўнай граніцы.

Па Совецкай Беларусі

ПРАБЛЕМА ВЯЛІКАГА ДНЯПРА

Геалагічныя партыі Беларускай Акадэміі навук закончылі цалявыя работы, звязаныя з праблемай Вялікага Дняпра. Партыі праводзілі з'ёмкі па трасах каналаў, якія злучаць Дняпро з Балтыцкім морам.

Адна з партый правяла дэтальную геалагічную здымку па рацэ Бярэзіне на плошчы 600 кв. км., дзе намечана месца пабудовы плаціны у сувязі з будаўніцтвам велізарных водасховаў.

У дадны момант пачата камеральная распрацоўка сабраных матэрыялаў, складаюцца профілі, геалагічныя карты.

У бліжэйшым часе Геалагічны інстытут акадэміі прыступіць да свідравання глыбокіх свердлавін.

УСЕБЕЛАРУСКАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ ГІСТОРЫКАЎ

Беларускі дзяржаўны універсітэт у студзені праводзіць першую ўсебеларускую канферэнцыю гісторыкаў. Прэзідэнт Акадэміі Навук акадэмік Горын зробіць на канферэнцыі даклад на тэму «Гістарычная навука і гістарычная асвета ў капіталістычных краінах».

На канферэнцыі будуць заслуханы даклады акадэміка Шчарбакова аб навукова-даследчай рабоце і гістарычнай асвеце ў БССР і дацэнта Карнейчыка аб выкладанні гістарычных навук у вышэйшых навучальных установах.

У рабоце канферэнцыі прыме ўдзел 100 дэлегатаў—гісторыкаў вышэйшых навучальных устаноў, выкладчыкаў гісторыі ў педагагічных тэхнікумах і школах. (БЕЛТА).

МІЛЬЁН РУБЛЁЎ НА ДЗІЦЯЧЫЯ САНАТОРЫІ, ПЛЯЦОЎКІ І ЛАГЕРЫ

У 1935 г. Наркаматам аховы здароўя БССР будзе праведзен рад важных аздараўленчых мерапрыемстваў сярод дзяцей. Намячаецца на ўтрымане дзіцячых санаторый, пляцовак і лагераў адпусціць каля мільёна рублёў.

Упершыню будуць адкрыты начныя дзіцячыя санаторыі па тыпу аналагічных рабочых санаторыяў. У Чонках каля Гомеля адкрываецца новы дзіцячы санаторый на 150 дзяцей. Усяго праз дзіцячыя ўстановы па лініі аднаго толькі Наркамата аховы здароўя будзе прапушчана 7.200 дзяцей.

НА МЕНСКІМ СТАДЫ�ЕНЕ «ДЫНАМО»
Чырвонаармеец №-скай часці іграе ў хокей.

ПАРУСНАЯ СТАНЦЫЯ У ГОМЕЛІ

Беларускім таварыствам выратаўдзіцця на водах арганізавана ў Гомелі сезонная парусная спорту. Адначасова створана парусная станцыя, якая будзе працаваць круглы год. Зімой парусы будуць устанаўлівацца на буерах (парусныя сані), а летам імі будуць аснашчаны парусныя яхты рэчнага тыпу.

Арганізацыя станцыі мае мэтай не толькі навучыць членаў таварыства ратавання на водах, тэхніцы кіравання парусамі, але і выхаваць якасці, неабходныя ў барацьбе з воднай стыхіяй: рашучасць, знаходлівасць і т. д.

НОВЫЯ КІНО-СЦЭНАРЫІ

У Белдзяржкіно паступіў рад кіно-сцэнарыяў, якія будуць пушчаны ў вытворчасць у 1935 г.

Сярод новых сцэнарыяў «Юнак» па аповесці рускага совецкага пісьменніка Барыса Левіна, «Шукальнікі шчасця»—ленінградская драматурга Зельцера і беларускага драматурга Кобеца; калгасная камедыя «Надружаныя»—сцэнарый Маркінай і Вітуноўскага; «Днепр гарыць» — Варашкі; «Салавей» — Бядулі; «Ордэн»—Шапавалава; «Совесть» — Галаўчынера; «Меч нібелунгаў»—Самуйленка; «Вялікі Днепр»—Брадзянскага і інш.

У ўпаўнаважанага Камісіі Совецкага Кантроля па БССР

АБ ПАРУШЭННІ ПАСТАНОВЫ ЦК ВКП(б) і СНК СССР АБ ЗАБАРОНЕ САМАЧЫННАГА ПАВЫШЭННЯ ЗАРПЛАТЫ

Не гледзячы на пастанову ЦК ВКП(б) і СНК СССР аб забароне самачыннага павышэння заработнай платы, кіраўнікі раду арганізацый БССР павысілі зарплату значнай частцы работнікаў свайго апарата.

За грубае парушэнне пастановы ЦК і СНК упаўнаважаным Камісіі Совецкага Кантроля па БССР тав. Іваановым на вінаватых накладзены адпаведныя спагнанні.

Кіраўніку Белводгаса Рудзінскаму за павышэнне зарплаты раймеліратару Аршанскага раёна, за сістэматычнае парушэнне закладу дзяржнармавання (аклад павышан 10 работнікам апарата) абвешчана суровая вымова. Таксама абвешчана вымова бухгалтару Белводгаса Кучынскаму.

Дырэктар завода «Ударнік» Андрэеў 4 рабочых перавёў у вышэйшыя разрады без усякіх падстаў. Андрэеву абвешчана вымова. Намесніку кіраўніка Белдзяржвыдавецтва Эстрыну за павышэнне зарплаты двум работнікам пастаўлена на від. Абвешчана вымова за павышэнне зарплаты дырэктару Белхарчтанцлю Сямёнаву.

Кіраўніку базы Электразбыту Гашнікаву абвешчана суровая вымова з папярэджаннем. Намесніку кіраўніка базы Пеўзнер за невыкананне ўказання, дадзена яму асабіста ўпаўнаважаным Камісіі Совецкага Кантроля аб тэрміновай адмене незаконнага павышэння зарплаты, з работы знят з забаронай займаць адказныя пасады на працягу году.

Абвешчана вымова намесніку наркома мясцовай прамысловасці БССР тав. Кладонікаву за павышэнне зарплаты шоферу з 200 да 240 руб.

Упаўнаважаны Камісіі Совецкага Кантроля па БССР тав. Іваноў даў катэгарычнае ўказанне ўсім вышэйадзначаным кіраўнікам аб неадкладнай адмене сваіх загадаў пра незаконнае павышэнне зарплаты. (БелТА).

ВЫКАНАЦЬ САМААБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ НА ПРОДАЖУ ІЛЬНУ

Перадавыя раёны БССР, якія датэрмінова закончылі план ільнозагатовак, узялі на сябе дадатковыя абавязацельствы па ільну. Аршанскі, Сенненскі, Касцюковіцкі і іншыя раёны абавязаліся дадаткова здаць сотні тон валакна. Гэтыя раёны сапраўды маюць магчымасць выканаць свае абавязацельствы, бо лён у іх добра ўрадзіў і многія калгасы маюць лішкі.

Справа заключаецца толькі ў тым, каб давесці да калгасаў і калгаснікаў аб льготах, якія яны атрымліваюць за лён, зданы звыш плана. Асіпавіцкі раён, напрыклад, здолеў арганізаваць гэту справу і выканаў свае абавязацельства. Ён абавязаўся здаць 20 тон, а здаў 20,8 тон. Капыльскі раён абавязаўся здаць 5 тон, здаў 5,9 тон. Уздзенскі замест узятых на сябе 10 тон здаў 19,6 тон. Менскі раён здаў 5 тон. Уваравіцкі замест 15 здаў 16,8 тон.

Аднак, рад раёнаў не выконваюць узятых на сябе абавязацельстваў, не гледзячы на тое, што маюць поўную магчымасць гэта зрабіць. Больш за ўсё гэта датычыць Сянно і Оршы. Гэтыя раёны першымі ў БССР выканалі планы ільнозагатовак. Як у Сянно, так і ў Оршы ёсць калгасы, якія маюць лішкі ільну. Але арганізацыі гэтых раёнаў не мабілізавалі калгасы і калгаснікаў на перавыкананне плана, на апрацоўку лішкаў трасты, кудзелі. Між тым на рынках як у Аршанскім, так і ў Сенненскім за апошні час зоўважаецца спекуляцыя ільном, лён перапрадаюць. Раённыя арганізацыі не вядуць з гэтым барацьбы. У выніку Сенненскі раён замест узятых на сябе 30 тон здаў усяго 19,7 тон. Зусім не выконвае свайго абавязацельства Аршанскі раён. Замест узятых на сябе 30 тон ён здаў усяго 4,6 тоны. Цярахоўскі раён замест 10 тон здаў усяго 2,8 тоны. Не выконваюць сваіх абавязацельстваў Клічаўскі, Любаньскі і Чачэрскі раёны.

Задача гэтых раёнаў — неадкладна арганізаваць пераапрацоўку і здачу лішкаў ільну дзяржаве, скарыстаўшы ўсе адыходы, давёўшы да кожнага калгаса і калгаснікаў льготы за перавыкананне плана ільнозагатовак.

НА ШАХМАТНЫМ ТУРНІРЫ-ЧЭМПІЯНАЦЕ СССР У ЛЕНІНГРАДЗЕ

У 11 туры (20 снежня) выйгралі: Мазель у Дубініна, Верасаў у Фрэймана і Румін у Панова. Закончылі партыі ў нічыю: Юдовіч—Алатарцаў, Багатырчук — Левенфіш і Белавенец — Раузер. Не закончаны партыі: Лісіцын — Савіцкі, Кан — Рабіновіч, Рагозін — Чаховер і Макагонаў — Ільін-Жэнеўскі, пры перавазе ў Савіцкага, Рабіновіча і Макагонава.

СТАНОВІШЧА ПАСЛЯ 11 ТУРУ:

Алатарцаў плюс 6,5 з 9, Мазель плюс 6,5 з 10, Юдовіч і Белавенец — па плюс 6,5 з 11, Багатырчук плюс 6 з 9, Румін і Рабіновіч па плюс 5,5 з 9.

ХРОНІКА

• НОВЫЯ ПАНІЖАНЫЯ РОЗНІЧНЫЯ ЦЭНЫ НА БАЛАНДСКІ І БАКШТЭЙНСКІ СЫР устаноўлены народным камісарыятам гандлю з 20 снежня. Сыр вышэйшага гатунку, які раней каштаваў 22 руб кілограм, будзе прадавацца па 16 руб. і сыр першага гатунку замест 20 руб. кілограм—па 16 руб.

• РАДЫЁ-ГАБІНЕТ З КАРОТКАЙ ХВАЛЕВАЙ СТАНЦЫЯЙ адкрываецца пры клубе імя Сталіна ў Менску. Па прадпрыемствах горада арганізавана 7 гурткоў радыё-аматараў.

• КАМАНДА З 13 ЛЕПШЫХ ЮНЫХ КОНЬКАБЕЖЦАЎ, лыжнікаў і стралкоў Менска прыме ўдзел за ўсесаюзным фізкультурным свяце піонераў і школьнікаў па ўсіх відах зімовага спорту ў Маскве. Свята адбудзецца ў студзені.

Радыцыя «Звязды», Наркамзем і саюз архітэктараў БССР скліканы ць нараду па пытанню

СЦЯГВАННЕ ХУТАРОЎ І ЎПАРАДКАВАННЕ КАЛГАСНАЙ СЯДЗІБЫ

На нараду запрошаюцца наступныя т.т.: Каранеўскі, Фрыдман, Лучына, Зайцаў, Васільеў (Наркамзем); Меншыкаў, Розенблюм (інстытут рэканструкцыі сельскай гаспадаркі); прадстаўнікі Акадэміі навук; землеўпарадчыкі: Касьянаў (Дзержынскі), Дарашкевіч (Менск), Пяртноў (Марыпаль), Забароўскі (Гомель), Балотнікаў (Дуброўна); архітэктары: Воінаў, Кірыленка, Камкін, Прэзма, Ескевіч і ед Белдзяржпраекта тав. Сукоўскі; старшыні калгасаў: «Вольная праца» Бярэзінскага раёна, і імя Леніна, Менскага раёна.

Нарада адбудзецца 26 снежня ў 5 гадзін вечара ў памяшканні рэдакцыі газеты «Звязда» (Совецкая, 63, 3-ці паверх, кабінет рэдактара).

Адк. рэдактар Н. ЛЕНЦНЕР.

Гукавы кіно-тэатр «Чырвоная Зорка» | Валікі заменны фільм У праграме гукавы Саюз кіно-журнал XVII Онцяб у Масква.

Гукавы кіно-тэатр «Пролетарый» | Самая весёлая камедыя Наслесны прынц рэспублікі

Кіно «Інтэрнацыянал» | Ад 20 снежня новая праграма

Кіно «СПАРТАК» | ЗА ШТО ЯЕ СУДЗІЛІ (ТЭРМІН) пройдзе ў 6 частках

СЁННЯ, 22 снежня у 7 гадзін вечара ў залі БелАН адбудзецца заключнае пасяджэнне інстытута гісторыі па абгаварэнню кнігі Акадэміка Шчарбакова.

У зале арганізавана археалагічная выстаўка.

Запрашаюцца гісторыкі-даследчыкі, аспіранты, гісторыкі, выкладчыкі сярэдніх школ і студэнты гістарычнага факультэта.

Дырэкцыя ін-та гісторыі БелАН.

СЁННЯ, 22 снежня ў 6 гадзін вечара ў памяшканні Дома Пісьменнікаў (Совецкая, 68)

АДКРЫВАЕЦЦА

першая нарада совецкіх арх. ітэктараў БССР

Просьба да ўсіх удзельнікаў нарады з'явіцца на нараду без спазнення.

АРГКАМІСІЯ.

ПАДПІСВАЙЦЕСЯ на 1935 год на газету ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР.

УМОВЫ ПАДПІСКІ: на 1 м.—2 р. 50 к. на 3 м.—7 р. 50 к. на 6 м.—15 р. на 1 г.—30 р.

Падпіска прымаецца: горбюро Саюздрука, агенцтвамі сувязі і газетаносцамі.

Здавайце падпіску своечасова не пазней 23 снежня і на больш доўгі тэрмін.

Памятайце, што доўга тэрміновая і своечасовая падпіска забяспечвае рэгулярную і своечасовую дастаўку газеты.

Даводзіцца да ведама рабіных журы па алімпіядзе самадзейнага мастацтва, што тэрмін правядзення ўсебеларускай алімпіяды пераносіцца у сувязі з тым, што рад раёнаў яшчэ не правялі адпаведнай падрыхтоўкі.

Заг. рэй—і гарана прапануецца разгарнуць работу ў раёне і горадзе і прыслаць падрабязны матэрыял аб выніках алімпіяды з адзначэннем вызначыўшыхся гуртковых і індывідуальных дараванняў.

АБ ТЭРМІНЕ ўсебеларускай алімпіяды будзе паведамлена дадаткова.

Старшыня совета ўсебеларускай алімпіяды самадзейнага мастацтва НКА БССР ДУМЕЦ.

ПАСТАНОВА

Менскага гарадскога совета ад 16 снежня 1934 г.

Разгледзеўшы матэрыял праверкі правільнасці налічэння і ўтрымання падаходнага падатку і льтэбору з рабочых і служачых арцелі „Чырвоны транспартнік", горнай канторы Галоўдартранса, Політэхнічнага інстытута, ЖАКТ'а № 32, УВСР № 91 і ЗРК каапераціі і дзяржгандлю, горсовет адзначае, што разлікавымі работнікамі памянёных арганізацый і ўстаноў у выніку нядбайных адносін да сваіх абавязкаў, дапушчан цэлы рад парушэнняў законаў аб падаходным падатку і культабору: аблічванне рабочых і служачых, недабор падаткаў і збору, недадача ільгот па шматсямейнасці і т. д.

Выходзячы з гэтага і кіруючыся арт. 36 Палажэння аб падаходным падатку, горсовет ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Матэрыял на бухгалтара арцелі „Чырвоны транспартнік" Авербуха, не справіўшага дапушчаных няправільнасцей, згодна акта праверкі ад 13 верасня г. г (за што ён, Авербух, быў аштрафаваны у 50 руб.), а злосна прадаўжаючага няправільнасці і зараз—накіраваць гарпрамурору для прыцягнення Авербуха да судовай адказнасці.

Прасіць тав. Гінзбурга разгледзець гэту справу ў тэрміновым парадку.

2. Аштрафаваць бухгалтароў горнай канторы Галоўдартранса Бабіцкага, Політэхнічнага інстытута—і Омара і ЖАКТ'а № 32—Брэна па 50 руб. кожнага.

3. УВСР № 91—Эльхінда і ЗРК каапераціі і дзяржгандлю—Эрдмана па 25 руб. на кожнага.

Абавязаць памянёных асоб накладзены штраф унесці ў пяцідзённы тэрмін на рахунак мясцовага бюджэта ў Белкомунбанку і аднімчыць усе дапушчаныя ненарматыўнасці.

4. Старшыні жакта № 32 Юхнаўцу і нам. дырэктара Політэхнічнага інстытута Сегалю за непрыняцце мер да знішчэння няправільнасцей пры налічэнні падаходнага падатку і культабору абвясціць вымову. Горсовет папярэджвае кіраўнікоў арганізацый і ўстаноў г. Менска, што ў далейшым за дапушчэнне ўсякага роду няправільнасцей пры ўтрымане падаходнага падатку і культабору вінаватых будуць прыцягвацца да адказнасці.

Старшыня Менгорсовета ЖУКСВІЧ.
Сакратар Менгорсовета ІПАТАЎ.

Кіраўніцтва мастацтваў Наркомасветы БССР

АБ'ЯЎЛЯЕ, што тэрмін падачы рукапісаў на конкурс п'ес для клубнай гарадской і калгаснай сцэны працягнут да 1 студзеня 1935 г.

Кіраўніцтва мастацтваў НК АСВЕТЫ.

АБ'ЯВА

МЕНСКАГА ГАРАДСКОГА ФІНАНСАВАГА АДДЗЕЛА

На падставе пастановы Менскага гарадскога совета ад 1 снежня г.г. Менскі гарфа аб'яўляе што:

1) тэрмін падачы домаўласнікамі спісаў па форме № 1 ПРАЦЯГНУТ да 28 снежня г.г. уключна;

2) спісы павінны быць паданы ўсімі без выключэння домаўласнікамі і органамі, кіруючымі дамамі (жакты і інш. арганізацыі);

3) у спісах адзначыць асоб, маючых права на чырвонаармейскія ільготы, з прадстаўленнем даведак.

МЕНГАРФА.

Друкарні газ. „ЗВЯЗДА" ПАТРЭБНЫ ПАДЧЫТЧЫКІ

Зварачацца да дырэктара друкарні Совецкая, 63, другі паверх.

—Гр-н РЫПІНСКІ Макар Адамаў, які пахо дзіць з вёскі Радомля, Чавускага раёна (жыве ў гор. Менску), змяняе імя МАКАР на імя Мікіта. Асоб, якія маюць пратэсты супроць змены імя, просяць паведаміць Менскае гарбюро загсаў, паказаўшы свае прозвішча, імя і месца жыхарства.

ПАТРЭБЕН ДВОРНІК (без прадастаўлення кватэры) Звяртацца: Совецкая 63, 3-ці паверх да заг. гаспадаркі выд. „Звязды".

Менскі гарадскі фінансавы аддзел

на падставе пастановы НКФ СССР ад 7.IX-1930 г. за № 624.

ПРАПАНУЕ ўсім вінёзепералічаным прадпрыемствам і арганізацыям, якія знаходзяцца на тэрыторыі г. Менска і Менскага раёна і якія абавязаны тымі ці іншымі плацяжамі ў бюджэт,

зарэгістравацца ў горфінаддзеле на 1935 г.

шляхам перадачы рэгістрацыйнай заявы па ўстаноўленай форме

Тэрмін рэгістрацыі—да 30 снежня 1934 г.

Рэгістрацыі падлягаюць:

прадпрыемствы дзяржаўнай і комунальнай прамысловасці, фабрыкі, заводы, майстэрні, арганізацыі, саматужна-прамысловай і сельскагаспадарчай каапераціі, ОРС'ы, сельспажыўтаварыствы і іншыя арганізацыі спажывецкай і інвалідная каапераціі, прадпрыемствы дзяржгандлю, транспартныя і пагрузачна-разгрузачныя арганізацыі, будаўнічыя і архітэктурныя канторы пры ўсіх пабудовах, аб'яднанні, трэсты, базы, склады розныя філіялы, канторы, снабзбыты, агенцтвы, бюро, кансультацыі і ўпаўнаважаныя, прадпрыемствы грамадскіх арганізацый, таварыствы, экспартныя арганізацыі, друкарні і граверныя майстэрні, навучальна вытворчыя ўстановы і фабзавучы, прадпрыемствы калгасаў, соўгасы і ўсе сельскія гаспадаркі пры арганізацыях, прадпрыемствах, установах і вайсковай часці, цырульні і іншыя майстэрні пры жактах, установах і арганізацыях, адкрытыя прадпрыемствы для прыняцця яды і напіткаў, буфеты і ўсе закрытыя сталовыя, дзе прадаюцца: піва, папіросы ці кандзіцерскія вырабы, а таксама ўсе іншыя арганізацыі, якія займаюцца прамысловай і гандлёвай дзейнасцю.

Прадпрыемствы з разгалінаванай сеткай да рэгістрацыйнай заявы прыкладаюць спіс аперацыйных адзінак.

Тыя з пералічаных арганізацый і прадпрыемстваў, якія абкладаюцца падаткам са звароту, бюджэтнымі выдаткамі і інш. плацяжамі ў цэнтралізаваным парадку Наркамфінам БССР або фінорганамі іншых гарадоў і мясцовасцей СССР, абавязаны замест рэгістрацыйнай заявы прадставіць фінаддзелу на пазней 10 студзеня 1935 г. даведку па ф. № 5.

Арганізацыі і прадпрыемствы, не ўплочваючыя падатку са звароту або іншых плацяжоў у бюджэт, з прычыны розных падстаў (адсутнасць абкладаемых зваротаў, вызваленне па ільготах, унутраныя звароты і т. д.), павінны не пазней 5 студзеня 1935 г. прадставіць Горфінаддзелу асобныя паведамленні аб адсутнасці ў іх абкладаемых аб'ектаў.

РЭГІСТРАЦЫЙНЫХ ЗАЯЎ

не прадстаўляюць толькі тыя адзінкі мясцовага значэння, звароты якіх абкладаюцца менскім горфінаддзелам у складзе ўсёй арганізацыі, куды ўваходзяць гэтыя адзінкі (напрыклад, крамы горгандлёпа, ЗРК, ОРС'аў, Белгандля і інш.).

Бланкі рэгістрацыйнай заявы і бланкі даведкі ф. № 5 выдаюцца ў Горфінаддзеле (вул. К. Маркса, Горсовет, 2-гі паверх, пакой 20).

За ўхіленне ад рэгістрацыі вінаватыя будуць штрафавацца да 100 рублёў.

17-XII-34 г.
гор. Менск.

МЕНСКІ ГОРФІНАДДЗЕЛ

МЕНСКАЕ АДДЗЯЛЕННЕ БЕЛДЗЯРЖТРАНСА

з 15 снежня г. г. ПРЫСТУПІЛА ДА ЗАКЛЮЧЭННЯ ДАГАВАРОЎ НА АЎТАГУЖАВЫЯ ПЕРАВОЗКІ І ТРАНСПАРТНА-ЭКСПЕДЫЦЫЙНАЕ АБСЛУГОЎВАННЕ.

ПРОСЬБА да ўсіх запікаўленых прадпрыемстваў і ўстаноў заключыць дагаворы да 1 студзеня 1935 г., пасля якога заключэнне дагавораў будзе спынена.

Адрас: Маскоўская, 3, 1 п верх, пакой 8

ТАБЛІЦА

35 тыража выйграшаў пазыкі «ЗРАШАЮЧАГА ГОДА ПЯЦГОДКІ» (бяспроцентна-бяспрайгрышны выпуск). Тыраж адбыўся 11 снежня ў г. Уральску.

№ № серый	№ № аблігацый	Сума выйграшу	№ № серый	№ № аблігацый	Сума выйграшу
0028	99*)	500	4542	47*)	200
0266	90*)	200	4581	87*)	500
0542	62*)	200	4711	08*)	200
0589	82*)	200	5508	65*)	200
0714	11*)	500	5533	65*)	200
0736	95*)	200	5591	05*)	500
0765	71*)	500	5770	94*)	200
1385	77*)	200	5775	75*)	500
1432	87*)	500	6007	64*)	500
1446	1—100	20	6065	100*)	500
1486	1—100	50	6204	46*)	200
1602	08*)	200	6208	05*)	500
1876	26*)	500	6277	21*)	200
1880	81*)	500	6287	13*)	500
2172	66*)	200	6302	08*)	500
2176	58*)	200	6592	90*)	200
2218	1—100	50	6706	79*)	500
2388	79*)	200	6985	74*)	200
2538	32*)	200	7063	50*)	500
2548	40*)	500	7444	74*)	200
2645	62*)	500	7689	09*)	200
2740	33*)	200	8028	83*)	200
2785	1—100	50	8056	59*)	200
2975	100*)	200	8114	51*)	200
3116	17*)	200	8606	11*)	200
3139	66*)	500	8636	34*)	200
3432	12*)	500	8669	84*)	200
3576	10*)	200	8821	10*)	200
3585	1—100	100	8889	1—100	50
3610	47*)	200	8946	52*)	200
3717	1—100	50	9099	55*)	200
3951	55*)	200	9368	32*)	200
3987	29*)	200	9432	28*)	200
4094	68*)	500	9628	98*)	200
4135	74*)	200	9670	94*)	200
4199	55*)	200	9730	18*)	200
4244	31*)	500	9785	29*)	200
4338	76*)	200	9821	10*)	200
4434	48*)	200	9940	1—100	200

*) Астатнія 99 нумароў аблігацый гэтых серый выйгралі па 20 руб. кожны нумар.

КІРАЎНІЦТВА АШЧАДКАСАМІ І ДЗЯРЖКРЭДЫТА БССР

Кіраўніцтва цырковымі, эстрадным і музычнымі прадпрыемствамі пры НКАсветы БССР „ЦЭБ" даводзіць да ведама ўсіх запікаўленых устаноў, арганізацый і асоб, што пастановай СНК БССР ад 16-XI—1934 г.

Яму надана выключнае права мастацкага абслугоўвання

ўсіх пляцовак, клубаў, тэатраў, летніх садоў, паркаў і т. д. на тэрыторыі БССР, забараніўшы ўсім іншым арганізацыям займацца гэтай справай.

Кіраўніцтва ЦЭБ'а: Менск, клуб імя VII з'езда профсаюзаў, тэлефон 22-755.

Упаўнаважаныя—ў г. г. Гомелі, Віцебску, Оршы, Бабруйску.

Менск, друкарня «Звязды». Выгуснаючы — БУТОМАЎ, ст. кіраўнік — БЯРОЗАВІК ст. метрэшчык — ПЕРАКЛАДНЕЎ. ст. стэрэатыпёр—ПЕДЗІК ст друкар АНУЧЫН. Тыраж 85.000 Уп. Галоўлітбіта № 6331.